## Аўтадарога ў абход тэрыторыі нацыянальнага парку «Белавежская пушча» будзе створана ў 2010-2011 гадах

**Аўтамабільная дарога ў абход тэрыторыі нацыянальнага парку «Белавежская пушча» будзе створана ў 2010-2011 гадах на ўчастку Ваўкаставец — Свіслач. Адпаведны ўказ № 244 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 11 мая.**

Даручэнне аб гэтым было раней дадзена кіраўніком дзяржавы з мэтай зніжэння экалагічнай нагрузкі на тэрыторыю Белавежскай пушчы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Рух на асобных дарогах Мінска будзе абмежаваны

**Пра гэта папрасілі папярэдзіць чытачоў «Звязды» ў сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі. Часовыя абмежаванні звязаныя з афіцыйным візітам у Беларусь прэзідэнта В'етнама Нгуен Мінь Чыета.**

У прыватнасці, 13 мая ў раёне 12 і 14 гадзін дня будзе перакрыты рух па праспекце Пераможцаў і праспекце Незалежнасці. У гэты дзень з 16.00 таксама часова абмяжуюць рух па МКАД, па праспекце Пераможцаў і плошчы Незалежнасці, а ў 19.00 — у раёне плошчы Перамогі. На плошчы Перамогі (і на пад'ездах да яе) абмежаванні па руху будуць і 14 мая ў 9.30, а ў 16.00 — у раёне Кастрычніцкай плошчы па праспектах Пераможцаў і Незалежнасці. У пяць гадзін вечара ў сувязі з наведваннем в'етнамскім лідарам комплексу «Мінск-Арэна» перакрыюць праспект Пераможцаў, вуліцу Нарачанскую і вуліцу Праектуемую. Часовыя абмежаванні руху транспарту па МКАД у кірунку Лагойскай шашы будуць 15 мая ў 9.00, а 16 мая ў 8.00 перакрыюць дарогі па маршруце МКАД — праспект Незалежнасці — Маскоўская шаша — аэрапорт «Мінск 2».

Шаноўныя ўдзельнікі дарожнага руху, пастаўцеся да часовых абмежаванняў з разуменнем і загадзя плануйце свой маршрут.

**Надзея ДРЫЛА.**

Футбол. Чэмпіянат краіны

# Суддзі раззлавалі Сяргея Гурэнку і Ігара Кавалевіча

### Пасля матча з БАТЭ трэнер дынамаўцаў падаў у адстаўку

**ПРАЙШЛІ матчы 9-га тура чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе. Матч паміж чэмпіёнам барысаўскім БАТЭ і віцэ-чэмпіёнам сталічным «Дынама» называлі «беларускім класіка». І выйграў яго чэмпіён — 1:0. «Дынама» такім чынам адкацілася на пяты радок турнірнай табліцы і адстае ад лідара БАТЭ на 7 ачкоў.**

Сапраўды, гэта было галоўнае супрацьстаянне першага круга чэмпіянату. З адпаведным антуражам — амаль цалкам запоўнены стадыён у Кунцаўшчыне, праўда, білеты можна было набыць і за гадзіну да матча. Якраз за гадзіну да гульні галоўны трэнер мінчан Сяргей Гурэнка доўга сядзеў на трэнерскай лаўцы на пустым стадыёне, куды яшчэ не дапускалі прыхільнікаў. Залішне казаць, што «Дынама» выйшла на гульню надзвычай зараджаным на перамогу. Бессэнсоўна пералічваць моманты і паўмоманты, якія былі ў абедзвюх камандаў, рэалізаваць у асноўны час ні аднаму з супернікаў іх не ўдалося. Толькі на другой дабаўленай хвіліне апошняй паловы матча Рэнан Брэсан па-майстэрску разрэзаў абарону дынамаўцаў і без варыянтаў для галкіпера прабіў у правы ніжні вугал.

А вось 73-я хвіліна гэтага паядынку, якая дагэтуль выклікае спрэчкі прыхільнікаў, цалкам магла стаць выніковай для «Дынама». Павел Няхайчык збіў на подступах да штрафной Антона Пуцілу, праўда, мяч паспеў адляцець да дынамаўскага форварда Аляксандра Гаўрушкі, які на пару з Андрэем Чухлеем выходзіў на варатара гасцей. Галоўны арбітр сустрэчы прыняў рашэнне спыніць гульню і прад'явіць жоўтую картку Няхайчыку, і свісток гэты, тым часам, быў на карысць тых, хто сфаліў. У дынамаўцаў, якія і дагэтуль наатрымлівалі картак за размовы з суддзёй, накіпела, і праз хвіліну сітуацыя ледзь не скончылася ўсеагульнай патасоўкай каля дынамаўскіх варот. Зноў у ход пайшлі жоўтыя карткі, і матч удалося-такі вярнуць у футбольнае рэчышча.

Затое пасляматчавая прэс-канферэнцыя стала працягам тэатра дынамаўскіх эмоцый. Сяргей Гурэнка ўзгадаў паядынак з БАТЭ, які адбыўся паўгода таму: «Мой калега (Віктар Ганчарэнка. — **Аўт.**) прадузята выказаўся пра тую гульню. Ён сказаў, што матч быў еўрапейскага ўзроўню, але на полі была адна каманда. У якой бы камандзе я ні быў, я ўсё жыццё буду памятаць гэтыя словы. Ніхто не мае права абражаць маю каманду», — пры гэтым дынамаўскі глаўком ударыў па стале з такой сілай, што ўздрыгнуў увесь прэс-цэнтр. І выйшаў, не стаўшы чакаць пытанняў журналістаў. Як высветлілася, для разборак з суддзямі. Там зноў былі ўдары па дзвярах судзейскай і заклікі зайсці ў распранальню і паглядзець у вочы хлопцам. Здаецца, Сяргей Гурэнка моцна пагарачыўся. І ў суддзяў бываюць памылкі, і магчыма, на 73-й хвіліне была менавіта такая, ад якой залежыць будучы лёс галоўнага трэнера «Дынама» ў такім прынцыповым матчы. Але прайграваць трэба таксама ўмець. Махаць куламі пасля прайгранага матча па меншай меры бессэнсоўна, ды і даказваць штосьці Ганчарэнку больш мэтазгодна было б падчас гульні. Учора Сяргей Гурэнка падаў у адстаўку. Выконваць абавязкі галоўнага трэнера ў «Дынама» пакуль будзе Сяргей Саладоўнікаў.

Віктар Ганчарэнка пракаментаваў спіч калегі наступным чынам: «Не разумею, чаму Сяргей так эмацыйна рэагуе на мае выказванні пасля сустрэчы паўгода таму. Я добра памятаю той паядынак. Нам удалося правесці шмат пазіцыйных атак, нягледзячы на тое, што каманда была стомленая пасля выязнога еўракубкавага матча з «Літэксам». Лічу, што нічога крыўднага ў адрас суперніка я тады не сказаў. Мяркую, што эмоцыі ўлягуцца і Сяргей па-іншаму пагля́дзіць на гэту сітуацыю».

Эмацыйна выказаўся ў бок суддзяў і галоўны трэнер «Нафтана» пасля паядынку з «Мінскам», які скончыўся нулявой нічыёй. Суддзі адмянілі ўзяцце варот наваполацкай камандай, за што і атрымалі рэкамендацыю ад Ігара Кавалевіча паўдзельнічаць у парадзе сэксуальных меншасцяў. Яшчэ адзін паядынак закончыўся з нулявой нічыёй — паміж гродзенскім «Нёманам» і салігорскім «Шахцёрам».

А бабруйская «Белшына», дэбютант вышэйшай лігі, працягвае свае сенсацыйныя подзвігі, не адпускаючы БАТЭ на далёкую адлегласць. На гэты раз, саступаючы «Партызану» (0:1), падапечныя Сяднёва спачатку лік зраўнялі, а потым і выйшлі наперад. Ад БАТЭ іх аддзяляе ўсяго два ачкі. На трэцім месцы, нягледзячы на паражэнне, застаецца брэсцкае «Дынама». Падапечныя Юрыя Пунтуса ў матчы з магілёўскім «Дняпром» забілі першымі, але потым двойчы прапусцілі. Двойчы прапусцілі і віцябчане ад жодзінскага «Тарпеда».

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

### по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

| Наименование предмета аукциона | Здание столярного цеха и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Продавец недвижимого имущества | Республиканское унитарное производственное предприятие «Гранит» тел. (01645) 4 34 89, факс (01645) 4 36 00 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Лунинецкий район, г. Микашевичи, ул. Маяковского, 37 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание столярного цеха, 1-этажн., 1990 г.п., общая площадь – 99,0 кв.м. Земельный участок площадью 0,0255 га, срок аренды – 49 лет, ограничения в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, использовать земельный участок для размещения производства, общественного питания, торговли, услуг |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | **9 017 930** |
| Сумма задатка, руб. | **901 790** |
| Реквизиты счета для перечисления задатка | ***р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения – по 24.05.2010 включительно.*** |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел.: (0162) 21 19 82; 23 12 63, 23 44 06, 20 87 85, 23 44 78, www.brest-region.by |

Повторный аукцион состоится **25 мая 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

***Подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 24 марта 2010 г. № 53. Заявления на участие в повторном аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество», с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 24 мая 2010 года включительно.***

Хакей-2010

# ТАТАР-ТАРАРАМ ПА-СЛАВАЦКУ

*Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Германіі*

Абракадабра з загалоўкам сённяшняга рэпартажу з сусветнага першынства па хакеі ў Кёльне — гэта своеасаблівая даніна павагі форварду славацкай зборнай і каманды «Гранд Рапідс Грыфініс» з Дэтройта **Томасу Татару**. Менавіта вакол яго асобы вяліся ўсе размовы пасля фінальнага свістка матча Беларусь — Славакія. Славак, які выступаў пад магічным нумарам 90, нейкім чынам змог загіпназаваць нашых Аляксея Калюжнага і Міхаіла Грабоўскага і так ўдала выступіць ў ролі «прыліпалы»-правакатара, што беларусы ў пачатку трэцяга перыяду вымушаны былі на ім тройчы фаліць. Вынік за гэтыя выдаленні не радасны — дзве шайбы і лічбы на табло 4:2 на карысць супернікаў.

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі галоўны трэнер зборнай Беларусі Эдуард Занкавец выказаў шкадаванне, што гульцы не змаглі належным чынам захаваць сваю перавагу, у тым ліку і галявую, здабытую ў пачатку сустрэчы, і завяршыць матч на мажорнай ноце. Вінаваты самі, заключыў Эдуард Канстанцінавіч, будзем рабіць дэталёвы аналіз гульні і рыхтавацца да наступнага матча з расіянамі, які пачнецца сёння ў 17.15 па беларускім часе. Ацэньваючы гульню Томаса Татара і яе ўплыў на агульны ход матча, беларускі трэнер сказаў: гэта звычайная з'ява ў хакеі, калі ёсць такі гулец, які здольны завесці не на жарт каго хочаш. З гэтай нагоды Эдуард Занкавец успомніў абаронцу фінскай зборнай Ярко Рууту, які пры неабходнасці арганізоўваў на хакейнай пляцоўцы міні-спектакль, ад якога супернікі толькі паспявалі запаўняць лаўку штрафнікоў. Беларускія журналісты выказалі пажаданне, каб такі «прыліпала» з'явіўся і ў стане нашай зборнай.

Настаўнік зборнай Славакіі, які добра знаёмы беларускім прыхільнікам, канадзец Глен Хэнлан высока ацаніў гульню абедзвюх камандаў, зазначыўшы, што яго падначаленым па ходу гульні давялося тэрмінова перастройвацца. Ці меў спецзаданне на матч з беларусамі Томас Татар? Адказ на гэтае пытанне настаўнік зборнай Славакіі сказаў па-руску: «нет».



Магчыма, Хэнлан зрабіў просты дыпламатычны пасыл у адрас свайго калегі з Беларусі, каб не пакрыўдзіць. Што ні гаварыце, а сітуацыя аказалася надзвычай пікантнай: яшчэ нядаўна Эдуард Занкавец працаваў у штабе і Курта Фрэйзера, і Глена Хэнлана, якія спрабавалі вывесці наш хакей на сусветны ўзровень. Пакуль жа прыходзіцца спраўляцца сваімі кадрамі, якія, на жаль, вельмі часта мяняюцца, што далёка не самым лепшым чынам можа адбівацца на агульнай сітуацыі ў зборнай.

Зрэшты, змена кадраў ніякім чынам кардынальна не паўплывала на выхад нашай зборнай у наступны этап турніру. Пры любым раскладзе сённяшніх матчаў у Кёльне: Беларусь — Расія і Казахстан — Славакія, зборныя Беларусі і Расіі ўжо ў кваліфікацыі. А вось зборная Казахстана пры віртуальным выйгрышы ў тры шайбы пакіне за бортам дванаццаці мацнейшых славакаў. Праўда, у спорце непрымальны ўмоўны лад накшталт «калі», «калі б» і г.д. Тут калі шанцуе — то мацнейшым.

Гісторыя ведае шмат прыкладаў, калі падзеі, якія адбываюцца на спартыўнай пляцоўцы, пачынаюць рэзка змяняюцца на 180 градусаў. У дачыненні да нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі гэта якраз той выпадак. Яшчэ нядаўна ў спарынгавых выязных матчах са зборнай Латвіі ў Рызе і камандай Чэхіі ў Празе нашы саступалі па ходу сустрэчы (0:2), аднак знаходзілі ў сабе сілы зраўняць лік, хоць канчатковыя лічбы на табло былі не нашу карысць. У папярэдняй сустрэчы ў рамках сусветнага першынства-2010 у Кёльне з казахамі мы таксама «гарэлі» (0:2), аднак змаглі зраўняць лік і ўпэўнена давесці матч да перамогі. Гульня са славакамі зноў пачыналася з ліку 2:0, а завяршылася крыўдным паражэннем. Вось такія арэлі. Вельмі хацелася, каб у найбліжэйшы час яны паднялі нас наверх.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## ПРАСІЎ «УЗНАГАРОДЫ» — ДАЛІ КАЛОНІЮ

**За атрыманне хабару ў буйным памеры судом Барысаўскага раёна Мінскай вобласці асуджаны начальнік па адміністрацыйна-кадравай службе і ідэалагічнай рабоце ААТ «Барысаўскае прадпрыемства музычных інструментаў».**

На працягу 2007—2008 гадоў названая асоба выконвала абавязкі генеральнага дырэктара прадпрыемства і патрабавала грашовай узнагароды ад індывідуальнага прадпрымальніка, які арандаваў і меў ва ўласнасці на прадпрыемстве такарныя і фрэзерныя станкі. «Гендырэктар» атрымаў некалькімі часткамі 5 тысяч долараў. А летась, калі ён быў старшынёй камісіі па ацэнцы таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў прадпрыемства, прапанаваў усё таму ж прадпрымальніку за «ўзнагароду» ў суме 3 мільёны беларускіх рублёў вырашыць пытанне аб ацэнцы вытворчага абсталявання ў парушэнне ўстаноўленага парадку вызначэння сапраўднага кошту. У момант атрымання грошай хабарнік быў затрыманы супрацоўнікамі Барысаўскага гарадскога аддзела УКГБ па г. Мінску і Мінскай вобласці. Сталічным упраўленнем Камітэта дзяржаўнай бяспекі была заведзена крымінальная справа.

Падчас следства і судовага разбору віна затрыманага была поўнасцю даказана. На падставе ч. 2 арт. 430 («Атрыманне хабару») Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь абвінавачаны асуджаны да 4 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Асуджаны таксама пазбаўлены права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў тэрмінам на 3 гады.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ВЫПІЦЬ З КАВАЛЕРАМ І ПАКАТАЦЦА... З ВЕТРЫКАМ

37-гадовы жыхар вёскі Шчытнікі, што каля Брэста, запрасіў да сябе даму 30 гадоў, раней судзімую за крадзеж. Спачатку яны добра выпілі, а затым ёй захацелася пакатацца. Вось яна ціхенька прыбрала ключы і па-англійску, не развітаўшыся, сышла з дому. Затым села ў яго аўтамабіль ды паехала сабе. Нацярпеўся страху за сваё аўто няўдачлівы кавалер. Але неўзабаве машыну знайшлі супрацоўнікі міліцыі і вярнулі гаспадару.

**Яна СВЕТАВА.**

## БЕЗ КІСЦІ

11 мая раніцай на ААТ «Чавускі льнозавод» рабочая атрымала цяжкую траўму. Пасля траўматычнай ампутацыі кісці рукі 35-гадовую жанчыну шпіталізавалі ў раённую бальніцу. Вядома, што траўму яна атрымала на працоўным месцы, у выніку неасцярожнага абыходжання з электрычным станком, на якім выраблěецца доўгае льновалакно. Вядзецца праверка.

**Алена КАЗЛОВА.**

## Абзац

◢ У Шклове сямігадовы веласіпедыст пацярпеў пры сутыкненні з аўтамабілем. Першакласнік ехаў на веласіпедзе па праезнай частцы і вырашыў выехаць на галоўную дарогу. Ён не ўступіў дарогу аўтамабілю, у выніку чаго і адбылося сутыкненне. Дзіця атрымала закрытую чэрапна-мазгавую траўму і было шпіталізаванае. У сувязі з гэтым ДАІ нагадвае, што дзецям да 14 гадоў забаронена выязджаць на дарогу на веласіпедзе.

◢ **РУУС Заводскага раёна Мінска праводзіць праверку па факце ўтаплення ў Чыжоўскім вадасховішчы вучня 9-га класа адной з мінскіх школ. Хлопчык прыйшоў з сябрамі на рыбалку. Як расказалі сябры, дзевяцікласнік вырашыў даплыць да аднаго з астравоў і адтуль лавіць рыбу. Не даплыўшы, пачаў крычаць і патануў. Людзі, што былі на беразе, выклікалі міліцыю, якая і выцягнула цела. Як лічаць медыкі, хутчэй за ўсё, у халоднай вадзе ў падлетка звузіліся сасуды, гэта т.зв. «сутарга купальшчыка».**

◢ Кіраўнік аднаго з дамоў-інтэрнатаў Верхнядзвінскага раёна атрымліваў хабар ад сваіх падначаленых. Так, з адной медсястры ён узяў $500 за працаўладкаванне ў інтэрнат яе знаёмай, з іншай — $200 за павышэнне. Яшчэ $300 атрымаў ад санітара за непрыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці за п'янства на працоўным месцы, што пагражала звальненнем. За хабарніцтва кіраўнік прыгавораны да 3 гадоў і 1 месяца пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

## Поўны абзац

◢ **Іркуцкія прыставы арыштавалі трох сабак за камунальныя даўгі гаспадароў. Сям'я запазычыла за камунальныя паслугі каля 130 тыс. рублёў. Такі доўг назапасіўся за паўтара года, і ніхто з гаспадароў плаціць не збіраўся. Таму было вырашана арыштаваць двух мопсаў і французскага бульдога. Па звестках прыставаў, гэтых сабак сям'я трымала для развядзення і наступнага продажу шчанюкоў. Кошт жывёлаў ацэнены ў 10 тыс. рублёў.**

◢ За мінулы год ліса ўкрала ад 200 да 250 прадметаў абутку ў жыхароў невялікага нямецкага гарадка Ферэн, а сёлета зноў узялася за старое. Жывёліна цягае ў бліжэйшы лес самы розны абутак — ад гумовікаў да хатніх тапачак. Усё гэта яна цягне з тэрасаў, лесвіц, ганкаў і садоў па ўсім горадзе. Сёлета ліса скрала абутак ужо ў чатырох чалавек. Як мяркуе ўладальнік лесу, рудая сваволніца цягае абутак сваім шчанюкам, каб тыя маглі забаўляцца.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## ВАДЫ Ў КАНАВЕ ЎЖО НЯМА, А ПРАБЛЕМА ЗАСТАНЕЦЦА?..

**ЖЫХАРКА вёскі Крулеўшчына Докшыцкага раёна працягла і эмацыйна распавяла па тэлефоне «гарачай лініі» пра сваю праблему, якая вядзе адлік з 1975 года. Калі коратка, з даўніх часоў паміж агароджамі суседніх участкаў існавала канава-ліўнёўка. І вось нядаўна ваду з той канавы спусцілі ледзьве не на ўчастак заяўніцы. Маўляў, іншага выйсця не было, паколькі менавіта ў гэты бок быў натуральны нахіл мясцовасці.**

Галоўным пытаннем, наколькі мы зразумелі з аповеду жанчыны, што яе турбавала, было пытанне бяспекі. Заяўніца хвалявалася, каб тая вада не заразіла чым калодзеж, размешчаны на яе ўчастку непадалёк ад канавы. Словы прадстаўніка санстанцыі, які прысутнічаў на месцы, што ніякай пагрозы няма, гаспадыню не задаволілі, тым больш калі ён адказаў, што ніякіх нарматываў — колькі павінна быць метраў ад калодзежа да канавы, няма...

**Урач-эпідэміёлаг Докшыцкага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Уладзімір ЛІТВІНОК,** які ўласна і выязджаў асабіста на месцы падзей, пракаментаваў сітуацыю наступным чынам.

— Нейкі час таму ваша заяўніца пачала прад'яўляць прэтэнзіі да суседа, чый дом стаяў некалькі вышэй за яе домаўладанне, маўляў, гэта менавіта сцёкі ад яго запаўняюць тую ліўнёўку. Пасля вывучэння сітуацыі суседу было дадзена прадпісанне выкапаць воданепранікальны адстойнік. Што, дарэчы, гэты чалавек і зрабіў, — паведаміў падрабязнасці Уладзімір Георгіевіч. — Ваду ж канавы трэба было некуды «скінуць». Сапраўды, натуральны нахіл мясцовасці дазваляў гэта зрабіць толькі ў бок участка вашай заяўніцы. На гэтым сышліся прадстаўнікі камісіі ў складзе старшыні сельскага Савета, галоўнага землеўпарадчыка раёна, прадстаўнікоў дарожнай і камунальнай службаў, санстанцыі. Дажджавую ваду спусцілі па канаве. Нічым яна не пагражае. З просьбай правесці аналіз вады жанчына не звярталася. Што ж датычыцца адлегласці, дык нарматыў існуе, напрыклад, на ўладкаванне адстойніка ад калодзежа. У гэтым жа выпадку было вымушанае разавае скідванне вады. У далейшым назапашванне ў канаве дажджавой вады магчымае хіба або пасля моцных ападкаў, або пасля зімовага перыяду. Усё гэта мы разам спрабавалі патлумачыць жанчыне, але яна чамусьці нікога слухаць не захацела.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАХАЎ ДА БОЛЮ

*Мужчына катаваў сваю сяброўку, а тая да часу цярпела*

Але вымушаная была ўсё ж такі звярнуцца ў міліцыю, супрацоўнікі якой затрымалі 32-гадовага падазронага. Паводле звестак **прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары РУЛІНСКАЙ,** 27-гадовая мінчанка, якая пражывае на вуліцы Бачылы ў Мінску, на працягу двух месяцаў на ўласнай скуры адчувала «каханне» мілага, церпячы ад яго здзекі, боль і прыніжэнне. А каб родныя не бачылі, якія сляды на целе пакідае моцнае пачуццё яе мужчыны, пацярпелая пазбягала з імі сустрэч. Каб уявіць, праз што прайшла няшчасная, трэба згадаць, што мужчына, напрыклад, тушыў акуркі на яе сцягне, біў гумавай палкай, сціскаў скуру пасатыжамі... Між іншым, затрыманы раней ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці, а на гэты раз ён можа быць пазбаўлены свабоды на тэрмін да 3 гадоў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## МАЛА ДАСТАЛАСЯ?

Беспрацоўнага з Баранавічаў чымсьці раззлавала сужыцелька, і ён выліў на яе гарачы тлушч. А затым узяў гарачы прас і пачаў «выхоўваць» жанчыну. Здзіўляе, што пісаць заяву ў міліцыю сужыцелька адмовілася.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ В ПОСТАВСКОМ РАЙОНЕ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

| Дата, время, место проведения аукциона | 14 июня 2010 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, III этаж, каб. 58) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена | №№ лотов | Адреса участков | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, рублей | Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение |
| | 1. | Лынтупский сельсовет, д. Саранчаны, ул. Строителей, 7А | 0,2499 | 224082824301000060 | водоохранная зона озера Саранчаны | 1 000 000 | 393 666 |
| | 2. | Лынтупский сельсовет, д. Войшкуны, ул. Центральная, 53 | 0,1951 | 224082803601000091 | водоохранная зона озера Болдук | 12 000 000 | 1 116 890 |
| | 3. | Лынтупский сельсовет, д. Войшкуны, ул. Центральная, 55 | 0,1645 | 224082803601000092 | водоохранная зона озера Болдук | 10 000 000 | 1 116 890 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона | внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах; возмещение Лынтупскому исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации | | | | | | |
| Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона | В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11 | | | | | | |
| Перечень документов, которые необходимо представить участникам аукциона до его начала | заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе); квитанция об уплате задатка; ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность | | | | | | |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения до 11.06.2010 включительно | | | | | | |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения | 10 % от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет Лынтупского исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе. | | | | | | |
| Адрес и номер контактного телефона комиссии | г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны: 8 (02155) 43180, 41132. | | | | | | |

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ❖ Независимая строительная экспертиза

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Производственное помещение общей площадью 89,5 $м^2$ | 35 789 085 | 3 500 000 |
| 2 | Помещение многофункциональное общей площадью 339,5 $м^2$ | 135 758 597 | 13 500 000 |
| 3 | Производственное помещение общей площадью 134,9 $м^2$ | 53 943 548 | 5 400 000 |
| 4 | Производственное помещение общей площадью 146,8 $м^2$ | 58 702 097 | 5 800 000 |
| 5 | Складское помещение общей площадью 206,8 $м^2$ | 82 694 780 | 8 200 000 |
| 6 | Производственное помещение общей площадью 66,4 $м^2$ | 26 551 902 | 2 600 000 |
| Помещения расположены в одноэтажном кирпичном здании. **Адрес объектов:** г. Гомель, ул. Добрушская, 51. **Продавец имущества:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Новобелицкого района. Цены указаны без НДС. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота. | | | |
| 7 | 1. Сооружение «Ограждение», общая длина 335 м.п., строение капитальное, ж/б панели на ж/б подпятниках, инв. № 42. | 9 679 509 | 480 000 |
| 8 | 2. Сооружение «Склад-навес», общая площадь 300,0 кв.м, год постройки – 1968, строение капитальное, инв. № 38. | 24 801 336 | 1 240 000 |
| **Продавец имущества:** Управляющий ООО «Реми». Адрес объекта продажи: г. Речица, ул. Луначарского, 97. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 10 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота. Цена указана без НДС. | | | |
| 9 | **Здание склада заполнительного.** Общая площадь здания 1166,9 кв.м. Материал стен – железобетонные плиты, кирпич. Площадь земельного участка – 0,2107 га. | 58 247 000 | 5 825 000 |
| **Продавец имущества:** КПСУП «Полесьестрой». Адрес объекта продажи: г. Хойники, переулок Мира, д.1а. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 10 % от цены продажи лота. Цена указана без НДС. | | | |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **До 17.00 26 мая 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| Дата, время, место проведения аукциона | **27 мая 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| Номер р/с для перечисления залога | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27; 77 52 87 (факс).**

## ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 28 мая 2010 г. в 15.00 состоится ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН (повторный) по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лота № 1:

| Наименование и адрес имущества, входящего в состав лота: | **Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-5661 (помещение нежилое) общей площадью 363,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Ульяновская, 60.** |
|---|---|
| Организатор торгов | **Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНН 102353509** |
| Место проведения торгов и приема документов | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| Начальная цена продажи, рублей | **661 158 497** |
| Размер задатка, рублей | **66 115 850** |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | **Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» – р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509** |
| Площадь земельного участка | 0,0378 га, что составляет 505/10000 долей земельного участка с кадастровым № 741000000003000115, правовой режим – право общего долевого постоянного пользования без разграничения границ на местности |
| Условия продажи | аукцион без условий |
| Срок и условия оплаты за объект | в течение 60 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами |
| Срок подачи документов, осмотра объекта и внесения задатка | **по 27 мая 2010 г. включительно** |

**Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.** Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае, если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Организатор торгов вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение аукциона не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов до проведения аукциона, а так же оплачивает Организатору торгов вознаграждение в размере 2 процентов от продажной цены предмета торгов в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

***Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» от 31 марта 2010 г.**

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 мая 2010 г.
№ 18 (212)


## ВЕДАЦЬ СВАЕ ПРАВЫ І ПРАЦАВАЦЬ У АКРУЗЕ

**Першым з усіх раёнаў Брэстчыны пасля выбараў у мясцовыя Саветы арганізацыйную сесію правёў Брэсцкі. 30 красавіка старшынёй раённага Савета дэпутатаў быў абраны Аляксандр САЛАНЕВІЧ. Аляксандр Паўлавіч — спрактыкаваны старшыня. Ён працаваў на гэтай пасадзе і ў мінулым скліканні.**

На пытанне, чаму так хутка правялі сесіі ў раёне і сельсаветах, Аляксандр Саланевіч адказаў:

— Напярэдадні вялікіх святаў мы хацелі, каб мясцовая ўлада была дзейснай і паўнамоцнай. Сесіі прайшлі ва ўсіх сельсаветах. У Радванічах, напрыклад, сесія адбылася праз дзень пасля выбараў, 27 красавіка. Былы старшыня пайшоў на пенсію, дык навошта, каб у асобным сельсавеце было безуладдзе? Старшынёй там абралі Анатоля Карэцкага, які адразу прыступіў да работы. Святочныя мерапрыемствы для ветэранаў прайшлі арганізавана, хораша, урачыста. Па ўсім бачна, што чалавек прыйшоў з жаданнем працаваць, з ідэямі. Хоць не так гэта проста цяпер — быць кіраўніком у сельсавеце, а таксама прадстаўляць насельніцтва ў якасці дэпутата.

Я ўсіх дэпутатаў настройваю: трэба ў сваёй акрузе працаваць. Ёсць такія, на жаль, якіх абралі, і яны забываюць пра гэта ледзь ці не да наступных выбараў. З дэпутатамі праводзім нарады, вучобу, просім іх унікаць ва ўсе дробязі вясковага жыцця, старацца вырашаць надзённыя праблемы, пісаць дэпутацкія запыты ў адпаведныя інстанцыі. Іншы раз яны гавораць: вось, маўляў, не адказалі, не прынялі да ўвагі зварот сельскага дэпутата. Кажу ў такіх выпадках: пішы, другі, трэці раз, а на чацвёрты ім, дакладна, стане няёмка. Важна, каб дэпутат ведаў свае правы, тады ён зможа і запатрабаваць адказ ад службовай асобы, а галоўнае — дзеянняў. Я таксама па першым часе, хоць і прыйшоў на працу ў Савет з райвыканкама, пераадолеў цэлы шквал супраціўлення асобных аддзелаў і службаў выканкама. У некаторых была пазіцыя, што Савет сам павінен займацца добраўпарадкаваннем, рамантаваць ФАПы і клубы, рабіць шмат іншага. Давялося праводзіць растлумачальную работу, паказваць на лічбах і дакументах, што ў раённага Савета няма грошай, а дэпутаты маюць асноўную работу. За кожны канкрэтны аб'ект ёсць адказная служба. Потым усё стала на свае месцы. Так і любы сельскі дэпутат, лічу, можа дабіцца, каб да яго меркавання і дэпутацкіх запытаў ставіліся з пэўнай ступенню павагі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

## АБРАЛІ СТАРШЫНЮ ГАРСАВЕТА

**Старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 26 склікання выбраны Міхаіл САВАНОВІЧ.**

У Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў адбылася ўстаноўчая сесія. На першым пасяджэнні была сфарміравана структура Савета. Выбраны старшыня Савета і яго намеснікі, сфарміраваныя прэзідыум і пастаянныя камісіі.

**«Мінск-Навіны».**

## РАЗАМ ВЕСЯЛЕЙ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Таісія БАТОРЫ, старшыня Ваўкоўскага сельскага Савета Пастаўскага раёна, у сваёй працы практыкуе штодзённыя сустрэчы і размовы з вяскоўцамі, асабліва пенсіянерамі і адзінокімі жыхарамі.**

**На здымку: старшыня ў час сустрэчы з жыхаркай вёскі Хрыстова.**

## АДНА З ВАСЬМІ

### абраных у Гомельскі абласны савет жанчын стала яго старшынёй

**Марыя БОНДАР, якая да гэтага займала пасаду начальніка ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама, цяпер узначаліла аблсавет.**

Першая сесія Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 26-га скликання зацвердзіла паўнамоцтвы ўсіх 60 дэпутатаў, абраных у ходзе выбараў, якія прайшлі 25 красавіка 2010 года. Сесія разгледзела пытанні арганізацыйнага характару. На ёй утвораны 9 пастаянных камісій, выбраны іх старшыні, а таксама прэзідыум абласнога Савета дэпутатаў у колькасці 11 чалавек. Паўнамоцтвы намесніка старшыні абласнога Савета дэпутатаў дэлегаваны Анатолю Татарынаву — дырэктару ААТ «Саўгас-камбінат «Сож».

**Толькі што адбылася і сесія новага складу Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў. Старшынёй яго абраны былы кіраўнік Цэнтральнага раёна Гомеля Іван БАРАДЗІНЧЫК. Ён задаволены складам дэпутацкага корпуса і лічыць, што народным абраннікам ёсць над чым працаваць:**

— Сённяшняму дэпутацкаму корпусу па сіле вырашэнне тых задач, якія ставіць кіраўніцтва дзяржавы. З 40 абраных у Гомельскі гарсавет дэпутатаў амаль што палова прыйшлі ў другі раз. Шмат кіраўнікоў, якія валодаюць каштоўнай жыццёвай і прафесійнай практыкай і здольныя вырашаць любыя праблемы. Ёсць у гарсавеце і моладзь. У ходзе перадвыбарнай кампаніі было шмат сустрэч з выбаршчыкамі. Тыя пытанні, якія людзі ставяць, датычацца не толькі іх асабіста, але і ўсяго горада Гомеля: гэта арганізацыя быту і адпачынку гараджан. У раёнах навабудоўляў — хранічнае адставанне па будаўніцтве аб'ектаў сацкультбыту — дашкольных, медыцынскіх устаноў. Калі ўзяць гістарычную частку нашага горада, тут знаходзяцца дамы, пабудаваныя адразу пасля вайны ці ў 60-я гады. Тэрміны капітальнага рамонту іх даўно прайшлі. Сёння шмат жылля выводзіцца з жыллёвага фонду, у тым ліку па прычыне яго аварыйнасці. Цяжкая задача, але ж усё роўна яе вырашаць трэба. Мы не зможам кардынальна змяніць усё адразу, але ж думаць пра тое, як павялічваць аб'ёмы фінансавання на капітальны рамонт жыллёвага фонду, трэба. Важныя і пытанні добраўпарадкавання. За мінулыя гады многа зроблена ў прывядзенні ў парадак цэнтральных дарог Гомеля, але ж адсталі ў ямачным і капітальным рамонце другарадных дарог, якія таксама нясуць дастаткова вялікую нагрузку. Таму стаіць задача знаходзіць сродкі і рацыянальна вырашаць разам з выканаўчай уладай пытанні добраўпарадкавання дарог у Гомелі. Мы павінны працаваць над прыняццем такіх нарматыўных дакументаў, якія дазволілі б больш эфектыўна працаваць нашай эканоміцы. Каб казна атрымлівала больш грошай у выглядзе падаткаў, што дазволіць вырашаць пытанні рамонту жыллёвага фонду, добраўпарадкавання і іншыя сацыяльныя праблемы, якія ў нас сёння ёсць.

**Упершыню ў абласны Савет дэпутатаў абраны пракурор Савецкага раёна Гомеля Міхаіл ПРУС. Ён узначаліў пастаянную камісію па законнасці і правапарадку:**

— Трэба пракантраляваць выкананне тых рашэнняў, якія былі прыняты яшчэ папярэднім складам Савета. Летась было прынята рашэнне аб дадатковых мерах па ўдасканальванні работы органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў сферы забеспячэння законнасці і правапарадку ў Гомельскай вобласці. Ставілі, напрыклад, задачу праводзіць абследаванне адзінокіх пажылых грамадзян у мэтах выяўлення перадумоў, якія пагражаюць іх жыццю і здароўю. І яшчэ адна задача: актывізаваць работу па аказанні дапамогі ў працаўладкаванні і забеспячэнні жылымі памяшканнямі грамадзянам, якія вызваляюцца з папраўчых устаноў — для таго, каб было менш рэцыдыву. Трэба паглядзець, як гэта работа выконваецца на месцах — да сельсаветаў. Такім чынам адну з задач работы камісіі я бачу ў тым, каб даведацца, як рашэнні, прынятыя Саветам раней, выконваюцца на месцах, ці актуальныя яны сёння, ці патрэбны нейкія змяненні. І пайсці далей у распрацоўцы новых напрамкаў дзейнасці па забеспячэнні законнасці і правапарадку на тэрыторыі Гомельшчыны.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

## Тэрмін — да 25 мая

**У першыя дні мая ў рэдакцыю прыйшоў ліст ад сям'і пенсіянераў Валковічаў з пасёлка Ратамка Мінскага раёна. Інвалід Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Мікалаевіч і яго жонка, удзельніца вайны Надзея Міхайлаўна, звярнуліся ў газету па дапамогу.**

Некалькі гадоў таму мы пісалі пра гэтую сям'ю, але тады тэма была больш радасная, святочная. «Вашу газету я выпісваю з 1947 года, — напісаў ветэран, — яна мне вельмі падабаецца. У 2006 годзе прыязджалі да нас з жонкай вашы дзяўчаты-карэспандэнты з нагоды 60-годдзя нашага з жонкай шлюбу. Павіншавалі, напісалі пра нас у газеце, надрукавалі нашы здымкі. Вельмі прыемна было нам, старым, ад такой увагі. Але сёння я звяртаюся да вас са сваёй крыўдай і болем. Нам з жонкай ужо па 86 гадоў. Сын наш памёр, старэйшая дачка — удава 63 гадоў, а малодшай прыйшлося звольніцца з працы, каб нас даглядаць. 24 лютага я звярнуўся ў Ждановіцкі сельскі Савет з просьбай замяніць агароджу ад вуліцы... Першы раз у жыцці я звярнуўся па дапамогу, але ніякага адказу ад улады не атрымаў. 15 красавіка па маёй просьбе дачка паехала на прыём да старшыні сельскага Савета. Старшыня паабяцаў у тыднёвы тэрмін агароджу замяніць... На гэтым усё і скончылася. Вельмі прашу вас, дапамажыце нам, старым і хворым, дажыць век па-чалавечы».

Мы неаднаразова пісалі, што да ветэранаў у нашай краіне — самая пільная ўвага і што ўсе іх праблемы мясцовая ўлада намагаецца аператыўна вырашаць. Таму адразу пасля атрымання ліста патэлефанавалі ў Ратамку і пацікавіліся ў Мікалая Мікалаевіча — магчыма, напярэдадні юбілею Перамогі агароджу ім ужо замянілі? Аказалася, што справа не зрушылася з месца. І ніякага адказу ад сельвыканкама пенсіянеры не дачакаліся. Крыўдна нам стала за нашых адданых падпісчыкаў Валковічаў. І крыўдна ўдвая, што нават напярэдадні 65-годдзя Перамогі пенсіянеры не дачакаліся задавальнення сваёй просьбы.

Мы звярнуліся па каментарый да старшыні Ждановіцкага сельскага Савета дэпутатаў Уладзіміра КАРАЛЬКО.

— Асобнага расходнага артыкула на патрэбы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў бюджэце сельвыканкама, на жаль, няма, — патлумачыў старшыня. — Аднак мы абавязкова знойдзем магчымасць зрабіць гэтую агароджу.

Акрамя таго, кіраўнік мясцовай улады паабяцаў абавязкова пад'ехаць да Валковічаў і асабіста пагутарыць з імі.

Сімвалічна, што менавіта 9 мая, пасля сустрэчы з Валковічамі, ён патэлефанаваў нашаму журналісту і запэўніў, што да 25 мая ім паставяць новую агароджу.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

## Прыгажосць патрабуе ахвяраў

**У рэдакцыю з калектыўным лістом звярнуліся абураныя жыхары Віцебска. Адразу дзевяць чалавек папрасілі дапамагчы выратаваць балконы іх кватэр ад разбурэння.**

У лісце адзначалася, што камунальнікі «ва ўльтыматыўнай форме» прапануюць жыхарам зняць рамы са шклом, устаноўленыя на балконах, хоць у свой час былі не супраць таго, каб людзі ўцяплялі такім чынам свае кватэры. (Жылы дом № 8, дзе жывуць скаржнікі, знаходзіцца на праспекце Фрунзэ ў Віцебску — у вельмі прэстыжным раёне, усяго ў некалькіх хвілінах хады ад Летняга амфітэатра.)

У ліку іншага незадаволеныя паскардзіліся і на тое, што ў доме, які пабудавалі 48 гадоў таму, не праводзілі рамонту — нават касметычнага.

Журналіст накіраваў пісьмовы зварот па ўзнятай чытачамі тэме ў віцебскі гарвыканкам. Афіцыйны адказ прыйшоў з прадпрыемства «Віцебская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка». Там адзначаецца, што зварот быў разгледжаны з выхадам на месца. На гэты момант вядуцца работы па ўцяпленні вонкавых сцен жылога дома з афарбоўкай фасаду. (Адзначу ад сябе, што «футры» на праспекце Фрунзэ робяць паралельна адразу на многіх дамах. У выніку праспект у раёне бліжэй да амфітэатра, безумоўна, стане больш прыгожым. Асабліва ў цёмны час сутак — дзякуючы падсветцы дамоў.)

Галоўны інжынер вышэйназванага прадпрыемства патлумачыў, што наступным этапам плануецца праводзіць работы па замене вокнаў і балконных блокаў, рамонце балконаў, работы на даху. Праектам прадугледжаны значныя змены ўстройства балконаў і іх вонкавага выгляду. Ажыццявіць гэта будзе немагчыма без дэмантажу аконных блокаў, устаноўленых жыльцамі на балконах. І пра ўсё гэта, як адзначыў спецыяліст, расказвалі жыхарам перад пачаткам рамонтных работ.

Напрыканцы паведамляецца, што раней ЖКХ выконвала рамонты пад'ездаў гэтага дома (неаднаразова), фарбавалі ніз балконных пліт, экраны і металічныя агароджы балконаў з боку галоўнага фасада, усталявалі прыбор электроннага рэгулявання падачы цеплавой энергіі, рамантавалі асфальтавае пакрыццё ў двары і гэтак далей. Летась рамантавалі мяккі дах над васьмю кватэрамі.

Як адзначылі жыхары, камунальнікі не прад'яўлялі прэтэнзій наконт устаноўкі балконных рамаў. Але трэба было ўсё афіцыйна ўзгадніць. І прэтэнзіі жыхарам маглі прад'явіць у любы момант. Ды і ў СМІ неаднаразова паведамлялася пра тое, што за самавольную перапланіроўку (і гэтак далей) жылля прадугледжаны штраф. Зразумела, шкада людзей, якія ў свой час патраціліся на добраўпарадкаванне балконаў. Але ж яны будуць жыць у доме з цёплай «футрай», а ў найбліжэйшай перспектыве і з новымі вокнамі. І пагадзіцеся — калі старыя рамы балконаў выходзяць на адну з галоўных вуліц горада, не вельмі гэта радуе вока. А прыгажосць патрабуе ахвяраў. Такая вось чарговая камунальная гісторыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У ЛЯСАХ ЛІКВІДАВАНА БОЛЬШ ЗА 1200 ЗВАЛАК

**Наша краіна багатая на лясы, тэрыторыя якіх займае плошчу каля 9,4 млн гектараў. Каб захаваць гэтае багацце, трэба падтрымліваць парадак на землях ляснога фонду і развіваць яго інфраструктуру.**

Сёлета на тэрыторыі лясоў лясгасамі ўладкавана каля 400 пляцовак для стаянак аўтатранспарту. Падрыхтавана 2800 месцаў адпачынку ўздоўж аўтамабільных дарог, зроблена больш за 540 малых архітэктурных формаў і 11 тысяч аншлагаў на прыродаахоўную тэматыку, арганізавана 37 новых экалагічных сцежак.

Паводле інфармацыі прэс-службы Мінлясгаса, сёлета ў першым квартале Дзяржаўнай лясной аховай праведзена 1100 рэйдаў, пасля якіх складзена 134 пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях. У лясах ліквідавана 1258 несанкцыянаваных сметнікаў, ачышчана ад захламленасці больш за 7 тысяч гектараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ВЕДАЙ СВАІХ ДЭПУТАТАЎ

## Дзмітрый ШАЎЦОЎ:

# «Мае плакаты ніхто не зрываў»

**На апошніх выбарах у мясцовыя Саветы за галоўнага ўрача сталічнай паліклінікі № 34 Дзмітрыя Шаўцова, які прэтэндаваў на дэпутацкае «крэсла» ў Мінскім гарсавеце, прагаласавала 75 працэнтаў выбаршчыкаў акругі. Адрыў ад іншых кандыдатаў-канкурэнтаў — а іх было трое — уражвае. Дзмітрый Яўгенавіч шчыра прызнаецца, што на перамогу ён спадзяваўся. Аб'ектыўна ацаніўшы ўсіх прэтэндэнтаў, прыйшоў да высновы, што яго ўласныя шанцы дастаткова высокія. Але стопрацэнтнай упэўненасці, зразумела, не было. Мы вырашылі распытаць пераможцу, цяпер ужо дэпутата Мінскага гарадскога Савета, чым запомнілася яму выбарчая кампанія, якія «тэхналогіі» ён выкарыстоўваў, каб перамагчы, і, нарэшце, дзеля чаго яму ўсё гэта было патрэбна.**

Дзмітрыю Шаўцову 36 гадоў. Ён скончыў Гомельскі медінстытут. Жанаты, выхоўвае двух хлопчыкаў. Не курыць (кінуў). Займацца спортам хацеў бы, але на гэта катастрафічна не хапае часу. Працоўны дзень у галоўнага ўрача сталічнай паліклінікі ненармаваны, і доўжыцца, здараецца, па 10—11 гадзін. Літаральна да апошняга часу сям'я Шаўцовых жыла ў інтэрнаце, і толькі нядаўна перабралася ў новую кватэру ў мікрараёне Лошыца.

Дзмітрый Яўгенавіч пераехаў у сталіцу пяць гадоў таму. А да гэтага працаваў першым намеснікам галоўнага ўрача Жлобінскага раённага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання (РТМА), куды ўваходзілі раённая бальніца, дзве паліклінікі — дарослая і дзіцячая, і раддом. Сцвярджае, што розніцы ва ўзроўні абслугоўвання насельніцтва паміж сталіцай і райцэнтрам практычна няма. За выключэннем хіба што аднаго нюансу: сталічная медыцынская дапамога больш набліжаная да гарадскога жыхара. А вяскоўцу, каб патрапіць у раённую бальніцу, неабходна спачатку прайсці абследаванне на ФАПе або ва ўчастковай бальніцы. І толькі калі там не дадуць рады, ён атрымае накіраванне ў раённы цэнтр.

Дарэчы, яшчэ падчас працы ў РТМА Шаўцова выбралі дэпутатам Жлобінскага раённага Савета 24-га скликання. Праўда, дабыць «тэрмін» да канца не ўдалося па прычыне пераезду ў сталіцу, але пэўны вопыт ён усё ж атрымаў.

— Ну і як, — цікаўлюся ў Дзмітрыя Яўгенавіча, — спадабалася быць дэпутатам?

— Спадабалася — не спадабалася... Не ў тым рэч. Я адчуў, што гэта важна — пасяджэнні, сустрэчы, кантакты, усё тое, што чалавеку незацікаўленаму падаецца фармальным ці непатрэбным. Дэпутат атрымлівае адкрыты доступ да першых асобаў, да выканаўчай улады, а значыць, і магчымасць вырашаць праблемы — у маім выпадку, праблемы аховы здароўя. Нават працуючы ў галіне медыцыны, цяжка прадугледзець усё, што можа спатрэбіцца той ці іншай медыцынскай установе. Безумоўна, заяўкі на кожны наступны год фарміруюцца і плануюцца. Але здараюцца і непрадбачаныя выпадкі: скажам, можа выйсці са строю дарагое абсталяванне. А сродкі ў бюджэце пад гэта не закладзеныя... Або ўтворыцца аварыйная сітуацыя і спатрэбіцца тэрмінова мадэрнізаваць будынак... Ды ці мала што! У дэпутата заўсёды ёсць магчымасць вынесці пытанне на сесію, пераканаць іншых, што выпраўленне сітуацыі з'яўляецца жыццёвай неабходнасцю. Калі пераканае — сесія можа прыняць рашэнне аб дадатковым фінансаванні.

— Інакш кажучы, дэпутат — гэта той, хто «выбівае» ў выканаўчай улады грошы на вырашэнне той ці іншай праблемы?

— Лепш сказаць, з'яўляецца «правадніком» паміж праблемамі людзей і магчымасцямі выканаўчай улады, — папраўляе Шаўцоў. — Ва ўсякім разе, тыя пытанні, якія лабіруе дэпутат, вырашаюцца значна хутчэй. Кіруючыся такой устаноўкай, я і рызыкнуў вылучацца.

Ніякіх эксцэсаў, па словах Дзмітрыя Яўгенавіча, падчас выбарчага «марафону» з ім і яго камандай не адбывалася. Канкурэнты — кандыдаты ад партый — паводзілі сябе карэктна, плакатаў з фотаздымкамі Шаўцова ніхто не зрываў і непрыстойных слоў на іх не пісалі. На фоне іншых кандыдатаў ад Куйбышаўскай акругі № 46 галоўны ўрач паліклінікі аказаўся самым высокааплатным, паколькі супернікі абвясцілі электарат аб адсутнасці даходаў.

— На мой погляд, такія іх піяр-тэхналогіі ўжо не спрацоўваюць. Можна, безумоўна, пазіцыянаваць сябе як беднага і безмаёмаснага. Але тады ў выбаршчыкаў узнікае сустрэчнае пытанне: калі ты не ў стане зарабіць грошы і паклапаціцца пра сябе, як жа ты будзеш клапаціцца пра іншых?.. Чуў я і такія выказванні кандыдатаў: маўляў, іду ў дэпутаты, каб потым праўдзіва даносіць да народа рашэнні сесій... Даруйце, але гэтыя рашэнні і так ні для каго не сакрэт, да таго ж яны тыражуюцца ў прэсе. А дэпутат, мне здаецца, павінен несці інфармацыю не столькі з «вярхоў» на «нізы», колькі наадварот. Напэўна, некаторыя кандыдаты самі не ўсведамлялі, куды і навошта яны вылучыліся, імі кіравалі амбіцыі — асабістыя і партыйныя.

Шаўцоў дастае з паліцы свой агітацыйны плакат з фотаздымкам і слоганам: «Не гаварыць аб праблемах, а вырашаць іх». На фотаздымку ён усміхаецца.

— Камусьці гэтая ўсмешка не падабалася, пыталіся ў мяне: а ўсміхацца навошта? Я тлумачыў: дэпутат — ён жа не партакрат, а чалавек з народа. Значыць, «пячатка заклапочанасці» на твары для яго зусім не абавязковая.

Дарэчы, падчас пікетавання (пікеты праводзіліся на апошнім этапе — агітацыйным, дзе Шаўцоў прысутнічаў асабіста) людзі яго пазнавалі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Падыходзілі, задавалі пытанні, нагадвалі аб праблемах: аб дэфіцыце медыцынскіх кадраў, аб немагчымасці заказаць талон да доктара на патрэбны дзень і час, аб якасці медыцынскага абслугоўвання, аб чэргах...

— Кадры — увогуле балючая тэма. Чаму менавіта на пярвічным узроўні ўтварыўся такі вакуум? Таму што гэта — «перадавая лінія фронту», працаваць тут вельмі цяжка, — тлумачыць Дзмітрый Яўгенавіч, пакуль мы, скарыстаўшыся часовым зацішшам, размаўляем у яго невялікім кабінеце на чацвёртым паверсе паліклінікі. — Рэч нават не ў зарплаце — ідучы на такое месца, чалавек прыкладна ўяўляе, якую будзе атрымліваць зарплату. Але ён не ведае, з якой каласальнай нагрузкай давядзецца сутыкнуцца. Тут трэба працаваць і за сябе, і за іншага (таму што на восем участкаў — тры ўчастковыя тэрапеўты), плюс візіты на дом, плюс дзясяткі наведвальнікаў штодня...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)


**ЗАО «ТК Банк» сообщает, что 23.05.2010 г. в 12.00**
по адресу: Исламская Республика Иран,
г. Тегеран, ул. Телегани, на углу ул. Неджатоллахи
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ, КОТОРОЕ СОБИРАЕТСЯ ПО ИНИЦИАТИВЕ СОВЕТА ДИРЕКТОРОВ БАНКА.**

**Повестка дня:** об определении размера вознаграждений членам Совета Директоров ЗАО «ТК Банк» за исполнение ими своих обязанностей.

Всю необходимую информацию по вопросам повестки можно получить в юридической службе ЗАО «ТК Банк».
**Тел. +375 17 294 50 06.**
УНП 807000163.

# 7 МОЦНЫХ МІФАЎ ПРА АЛКАГОЛЬ

**АЛКАГОЛЬ — гэта не толькі гарэлка, але і піва, якое для многіх людзей, як чай, з'яўляецца практычна штодзённым напоем. Але добра гэта ці дрэнна, і наогул — ці разумеем мы, як дзейнічае алкаголь на арганізм альбо здавольваемся прывычнымі стэрэатыпамі? Паспрабуем разабрацца...**

### Алкаголь павышае апетыт

Насамрэч лёгкі голад правакуецца толькі моцнымі напоямі, прычым ужытымі ў невялікай колькасці. Пад уздзеяннем спіртнога актывуюцца нервовыя цэнтры, якія адказваюць за адчуванне голаду-насычэння — на іх «абуджэнне» ідзе прыкладна 15 хвілін. Піць спіртное для ўзбуджэння апетыту — занятак небяспечны. Моцныя напоі раздражняюць слізістую страўніка і стрававода, выклікаючы пякотку і гастрыты.

### Шмат выпіць можа толькі здаровы чалавек

Здольнасць піць не п'янеючы, гэта значыць выпіваць адразу вялікую колькасць алкаголю без ап'янення ў навуцы называецца талерантнасцю да алкаголю. Многім гэта падаецца ўнікальнай здольнасцю, аднак медыкі лічаць такі «талент» прыкметай другой стадыі алкагалізму. Калі чалавек валодае высокай устойлівасцю да алкаголю, гэта яшчэ не значыць, што ў яго не можа ўзнікнуць алкагольнай залежнасці. Можа! Але гэта алкагольная залежнасць вельмі хутка перарастае ў цяжкае захворванне, часта з лятальным вынікам.

### Ад алкаголю таўсцеюць

Так! Ад алкаголю таўсцеюць, таму што алкаголь утрымлівае вугляводы, якія ў працэсе перапрацоўкі ў арганізме ператвараюцца выключна ў тлустыя кіслоты. Тлушч адкладваецца на жываце, клубах і г.д. Асабліва небяспечныя з пункту гледжання дыеталогіі моцныя напоі — кожны грам утрымлівае не менш як 7 ккал.

### Дарагія і якасныя напоі — бясшкодныя

Ніякі алкагольны напой як такі не з'яўляецца ні шкодным, ні бясшкодным. Небяспечным для здароўя з'яўляецца алкагольны яд, а дакладней — воцатны альдэгід, які ўтвараецца ў арганізме пасля перапрацоўкі этылавага спірту. І нават якасны алкаголь правакуе ўтварэнне алкагольнага яду, асабліва небяспечнага для сардэчна-сасудзістай сістэмы.

### Прымаючы антыбіётыкі, піць нельга!

Насамрэч алкаголь можа толькі панізіць дзеянне некаторых антыбіётыкаў, што не ўяўляе вялікай пагрозы для жыцця. Таксама могуць узнікнуць непажаданыя пабочныя эфекты накшталт празмернага ап'янення. Значна больш небяспечнае спалучэнне алкаголю з болесуцішальнымі, напрыклад, ібупрафенам, аспірынам. У такой сітуацыі вялікая рызыка пашкоджання слізістай страўніка і кішэчніка.

### Спіртное дапамагае заснуць

Гэта сапраўды так. Аднак алкаголь парушае цыклічнасць сну, і асабліва ўплывае на яго глыбокія фазы. Заснуўшы ў стане ап'янення, чалавек лягчэй абуджаецца, таму што прыкладна праз чатыры гадзіны алкаголь перастае дзейнічаць і нервовыя цэнтры растарможваюцца. А пры шматразовым паўтарэнні рытуалу «выпіць на ноч» снатворны эфект алкаголю і зусім затухае.

### Алкаголь здымае стрэс

Падняць настрой з дапамогай алкаголю сапраўды можна. Але для гэтага алкагольная доза павінна быць зусім невялікай — 20—30 мл гарэлкі або каньяку. Пад уздзеяннем спіртнога ў кроў інтэнсіўна выкідваецца дафамін — гармон радасці, які выклікае ў чалавека прыемнае ўзбуджэнне, эйфарыю. Вялікая ж доза прымушае мозг выпрацоўваць рэчывы вельмі актыўна, і за адзін вечар можна вычарпаць запасы дафаміну, якія б падтрымлівалі настрой увесь заўтрашні дзень. Таму раніцай пасля бурнага застолля стан чалавека характарызуецца як стрэсавы і дэпрэсіўны.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**15 мая — Міжнародны дзень сям'і**



**ДА 25 гадоў я была ўпэўнена, што НА ДВАІХ — гэта пра шампанскае. Але ў 25 давялося «папалавініць» усё, што ў мяне тады было. А як жа: прыйшоў ЁН, мой рыцар (з задавальненнем уяўляю выраз твару мужа, які прачытаў гэты пасаж)! У становішчы НА ДВАІХ жывём мы з рыцарам акурат 10 гадоў. І за гэты час з'елі не тое што дробнабуржуазны пудзік солі... Кожны, хто перажыў марш Мендэльсона, разумее глыбіню красамоўнага шматкроп'я. Пудзік солькі — гэта было б за шчасце! Словам, жартую і зычу ўсім добрым людзям мець такую СЯМ'Ю, якую вы заслужылі. А наступная інфармацыя з вуснаў кампетэнтных профі ў справе НА ДВАІХ, няхай дапаможа ніколі не шкадаваць пра тое, што вакантнага месца побач з вамі ўжо няма. З падачы Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў ролі кампетэнтных інфарматараў выступаюць загадчыца аддзялення планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій РНПЦ «Маці і дзіця» Ала КАМЛЮК, урач-сэксолаг Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Дзмітрый КАПУСЦІН і сямейны псіхолаг Алена ЗЯНЕВІЧ.**

# СПЫНІЦЬ БАІ НА ШЛЮБНЫМ ФРОНЦЕ!

## Ці ёсць у вас план?

Паводле амерыканскіх даных, крыху больш за палову дзяцей — выпадковыя, бо іх зачацце адбылося па-за планамі асобна ўзятых мужчын і жанчын. Вядомыя выпадкі, калі гэтая выпадковасць аказвалася шчаслівай, аднак сёння спецыялісты ў галіне шлюбу і сям'і нічога добрага ў падобных сюрпрызах не бачаць. Зачацце і нараджэнне дзіцяці гадоў сто таму — гэта адно, цяпер — зусім іншае, мяркуюць профі. Нездарма ва ўсім свеце, і, вядома, у нашай краіне з'явілася служба планавання сям'і — жаночыя кансультацыі, цэнтры здароўя моладзі, абласныя кансультацыі «Шлюб і сям'я», Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця». Задачы службы — падрыхтаваць пару да жаданай цяжарнасці і не дапусціць цяжарнасці нежаданай. Наогул сучасны чалавек яшчэ да пачатку палавога жыцця павінен атрымаць уяўленне пра планаванне нараджэння дзяцей, бяспечнае мацярынства і нават грудное выкормліванне.

Фізіялагічныя метады планавання сям'і прызнаюцца ненадзейнымі. Для рэгулявання нараджальнасці неабходна прымяняць сучасныя кантрацэптывы. Адназначна не рэкамендуецца падбіраць іх па ўласным жаданні, падказцы знаёмых ці інфармацыі, атрыманай з інтэрнэта. Такі выбар хутчэй нашкодзіць, паколькі кожны метад валодае не толькі пэўным станоўчым дзеяннем, але і пабочнымі эфектамі. Сродкі кантрацэпцыі развіваюцца гэтак жа актыўна, як і ўся медыцына ў цэлым, так што без спецыяліста можна ніколі не даведацца пра больш бяспечныя і простыя ў выкарыстанні навінкі. Узяць хоць бы гарманальную кантрацэпцыю. Нізкія і мікрадозы эстрагенаў могуць цяпер уводзіцца праз скуру і слізістыя. Спецыялісту вядома, каму і калі патрэбны прафілактычны і лекавы эфекты гарманальнай кантрацэпцыі. Дарэчы, доказаў адносна таго, што ўжыванне гарманальнай кантрацэпцыі спрыяе развіццю анкалогіі малочнай залозы, на гэты момант не існуе.

Такі метад рэгуляцыі нараджальнасці, як аборт, нельга лічыць аптымальным, і, тым не менш, даступнасць гэтай паслугі ў медустановах краіны дазваляе гаварыць пра адсутнасць крымінальных абортаў. А менавіта яны ў першую чаргу падрываюць асноўны прынцып Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў гэтай справе: у любым узросце аборт павінен быць бяспечным. Жанчына не павінна загінуць у выніку маніпуляцыі. Іншая справа — развіццё ўскладненняў. Гэтая рызыка, безумоўна, застаецца. Абсалютна бяспечных метадаў аборту не існуе і наўрад ці калі-небудзь такія з'явяцца. Дастаткова нагадаць, што 1/3 бясплодных жанчын перарвалі першую цяжарнасць.

Беларускія гінеколагі загаварылі аб прымяненні ў Беларусі ўжо ў гэтым годзе медыкаментознага аборту. Нягледзячы на тое, што размова ідзе пра неінвазіўны, нетраўматычны метад, і ў гэтым выпадку нельга гаварыць пра абсалютную адсутнасць ускладненняў. Выконвацца і кантралявацца медыкаментозны аборт будзе гінеколагамі. Выкарыстанне рэкамендуецца ў тэрмін да 49 дзён ад апошніх месячных. Медыкаментозныя прэпараты спрыяюць спачатку заміранню цяжарнасці, а потым яе эвакуацыі. У адрозненне ад вакуум-аспірацыі медыкаментозны аборт не патрабуе грунтоўнага папярэдняга абследавання, якое ў выніку не паспявае зрабіць дзесьці кожная трэцяя жанчына. Прыблізны кошт новага віду перарывання цяжарнасці — 200 тысяч рублёў.

Пара, якая плануе цяжарнасць, павінна зрабіць дзеля будучага дзіцяці дзве рэчы — трымацца здаровага ладу жыцця (палавыя клеткі надзвычай адчувальныя да любых шкодных фактараў, у першую чаргу да шкодных залежнасцяў) і звярнуцца да спецыяліста, абследавацца. Трэба ведаць, што для наступлення цяжарнасці патрабуецца шэраг момантаў: сперматагенез, авуляцыя, узаемадзеянне цэрвікальнай слізі і спермы, стан поласці маткі, праходнасць матачных труб і іх анатамічная сувязь з яечнікамі, асемяненне. Нягледзячы на тое, што большая частка пералічанага адносіцца да здароўя жанчыны, роля мужчыны ў адсутнасці цяжарнасці значна ўзрасла, як, дарэчы, і спалучэнне фактараў мужчынскай і жаночай бясплоднасці. Адсутнасць цяжарнасці на працягу года адкрытага рэгулярнага палавога жыцця з'яўляецца падставай для паўторнага звароту да спецыялістаў.

Да актуальных праблем бясплоднасці цяпер адносяцца рост колькасці дэфектаў авуляцыі, спалучанай жаночай бясплоднасці, змяншэнне эфектыўнасці пластычных аперацый (мэтазгодным цяпер лічыцца выдаленне непраходнай трубы цалкам, а не толькі непраходнага ўчастка), завышэнне ролі інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Што да апошніх, то акцэнт павінен рабіцца не на так званых «нармальных жыхарах» мікрафлоры палавых органаў жанчыны — урэаплазме і гарднерэлах, напрыклад, а на трыхаманадах, хламідыях, цытамегалавірусе.

## Ці ёсць у вас сэкс?

Многія задумаліся. Адны — над тым, ці адносіцца да сэксу самастымуляцыя, другія — ці можна назваць сэксам тое, што адбываецца ў іх час ад часу. Наогул сэкс уваходзіць у склад такога паняцця як якасць жыцця. Аднак малая колькасць урачоў-сэксолагаў і нізкая колькасць зваротаў насельніцтва да іх у нашай краіне наводзіць на думку, што ў беларусаў інтымная сфера стаіць асабняком ад памянёнага паняцця. Прычынай таму — нізкая сэксуальная культура нацыі. З-за гэтай нізкай культуры нашы мужчыны не сочаць за сваім здароўем, эксперыментуюць на сабе з дапамогай пілюль, пра якія фактычна нічога не ведаюць, а жанчыны (кожная трэцяя, дарэчы) практыкуюць «паводзіны кастрыравання». Слабы пол проста не ведае, што неасцярожнае слова ў бок мужчыны можа вымусіць апошняга адмовіцца ад інтымных адносінаў на дзесяцігоддзі.

На прыём да айчынных сэксолагаў прыходзяць галоўным чынам мужчыны. Расстройствы ў іх бываюць розныя, а вось пасылаў, бадай, толькі два. Або партнёрка адправіла, маўляў, няхай з табой там папрацуюць, або сам вырашыў крышку падкарэкціравацца, маўляў, на ўсякі выпадак. Між тым, вырашэнне сэксуальнай праблемы — гэта не барацьба з лішнімі кілаграмамі, чым можна займацца і ў адзіночку. На прыём да сэксолага трэба прыходзіць з сэксуальным аб'ектам, разам з ім «працаваць» над праблемай.

Няма пары, у якой на працягу сямейнага жыцця не ўзнікалі б тыя ці іншыя пытанні адносна парушэння сэксуальнай гармоніі. У такіх сітуацыях партнёры могуць дапускаць тыповыя памылкі. Жанчыны, напрыклад, ігнаруюць праблему. Калі яна датычыцца іх саміх, нішто не перашкаджае ім рабіць выгляд, што ўсё нармальна. Калі ж праблема звязана з іх мужчынам, яны разважаюць прыкладна так: «Грошы прыносіць? І добра». Аднак жанчына можа вярнуцца ў сэкс нават праз 20 гадоў устрымання — з'явіўся б аб'ект. З мужчынам складаней. Па-першае, найбольш частыя сэксуальныя праблемы ў іх — парушэнні, звязаныя з эрэкцыяй і эякуляцыяй — не схаваеш і не замаўчыш. А калі так, значыць, партнёр перайшоў на лаву запасных, што ў сваю чаргу паграджае вылетам з вялікага сэксу. Калі абыякавая да сэксуальнай паўзы жанчына дастанецца мужчыну з моцнай палавой канстытуцыяй, той адшукае выйсце — будзе апрацоўваць дзялянку на баку. Не здольны на здраду мужчына са слабай палавой канстытуцыяй рызыкуе ў сэкс ужо не вярнуцца. Асабліва калі паўза прыпала на 40-45 гадоў. Спроба вяртання да палавога жыцця праз нейкі час можа праваліцца — з-за слабасці эрэкцыі ці заўчаснай эякуляцыі. Словам, з узростам партнёрка павінна заахвочваць мужчыну да «подзвігаў», а не спрыяць паўзе.

Асноўная колькасць праблем у інтымнай галіне — родам з... дзяцінства. Калі ваша сэксуальнае жыццё пакідае жадаць лепшага, паспрабуйце з дапамогай сэксолага высветліць, якія памылкі ў вашым выхаванні дапусцілі бацькі, і дапамажыце свайму партнёру зрабіць тое самае. Не дапускайце грубых памылак пры выхаванні сваіх дзяцей.

## Ці ёсць у вас шанц?

На што спадзяюцца мужчыны і жанчыны, калі ўступаюць у шлюб? На тое, што «мінусы» партнёра можна будзе падрэдагаваць. Асабліва грашаць тут жанчыны, якія не хочуць разумець, што кожны чалавек прыходзіць у шлюб са сваім багажом, атрыманым у спадчыну ад сваёй сям'і. Ні выкінуць, ні падкарэкціраваць гэты скарб немагчыма.

Стомленыя барацьбой з заганамі партнёра жанчыны часам ідуць да псіхолага. Абсалютная большасць кліентаў псіхолагаў — жанчыны, якія нават не могуць дакладна сфармуляваць, што менавіта іх не здавальняе ў адносінах. Партнёры да кансультацыі далучаюцца вельмі рэдка. Беларускім мужчынам псіхолаг падаецца нейкім шаманам, які чытае думкі на адлегласці.

Існуе чатыры ўзроўні сумяшчальнасці партнёраў у шлюбе: узровень інтымных адносінаў, псіхалагічны (тэмперамент), ролевы і маральных каштоўнасцяў. Самы праблемны — ролевы, які мае дачыненне да размеркавання абавязкаў у галіне побыту і гаспадарчых спраў: хто што гатовы рабіць сам і чаго чакае ад партнёра? Жанчыны ў нас, як правіла, вельмі шмат працуюць і шмат «змагаюцца» з менш актыўнымі, часам інфантыльнымі, мужчынамі.

Пачынаць вырашэнне любога пытання трэба, як вядома, з сябе. У першую чаргу жанчынам-змагарам трэба ўзгадаць пра ўласную жыццёвую прастору. Сектару «для сябе» ў агульным раскладзе нашага часу і сіл павінна належаць да 30 працэнтаў. Астатнія 70 працэнтаў можна размеркаваць паміж прафесіяй і сям'ёй так, каб гэта не шкодзіла, на вашу думку, ні аднаму, ні другому. Наша частка жыцця «для сябе» — крыніца энергіі. Пустая крыніца нараджае незадаволенасць сямейным жыццём. Таму важна пашырыць сферу для сябе, і тады з новымі сіламі працей будзе дыхаць як у прафесіі, так і ў сям'і.

У дзяцінстве хлопчыкі гуляюць у стралялкі і машынкі, а не ў лялькі і каструлькі, якія, зразумела, маюць большае дачыненне да сямейнай схемы. Мужчынкі растуць, іх цацкі становяцца больш дарагімі, але лялькі з пасудкай у іх сферу інтарэсаў па-ранейшаму не ўваходзяць. Словам, на працягу свайго станаўлення мужчыны ніяк ці амаль ніяк не ўцягнуты ў побытгаспадарку. Уцягнуць мужа ў гэты працэс — задача жонкі. Сапраўдны мужчына не павінен атрымліваць задавальненне ад мыцця посуду, але мудрая жанчына павінна даць яму правільны пасыл, маўляў, «зрабі дзеля мяне, любімай».

Для мужчын жыццё да ЗАГСа істотна адрозніваецца ад таго, якім яно становіцца пасля. Сітуацыю мяняе адно жаночае слова: «павінен». Але ў сапраўднасці ніхто нікому нічога не павінен! «Хацелася б», — вось пасля чаго магчымы дыялог, паколькі для любога чалавека важна ўспрымаць сітуацыю не як патрабаванне, а як шанц. Калі мы чагосьці патрабуем, аб'ект нейкі час трывае, але аднойчы абавязкова выбухне, прадэманструе агрэсію або замкнёнасць. Чым больш выхаваны наш мужчына, тым менш схільны ён будзе да агрэсіі і больш да замкнутасці. Уявіце сабе, спадарыні, што кожны дзень да вас прыходзіць суседка і пастаянна псуе вам настрой. І тое ёй у вашым доме не падабаецца, і гэта. І так дзень за днём. Аднойчы вы абавязкова выбухнеце або... зробіце выгляд, што вас няма дома і замкняцеся.

У кожнага чалавека ёсць запаветная тэрыторыя. Падчас стасункаў з іншымі людзьмі мы выходзім са сваёй тэрыторыі ў нейтральную зону, дзе павінны весці перамовы, дыялогі і г.д. На жаль, жанчыны грашаць тым, што рэгулярна забягаюць на тэрыторыю мужчыны, чагосьці патрабуюць, на нечым настойваюць. Іх уласная тэрыторыя тым часам губляе свой некалі прывабны выгляд. Аднойчы мужчына страчвае жаданне не тое што зазірнуць на тэрыторыю партнёркі, але нават выйсці на нейтральную. Чым часцей жанчына робіць набегі, тым хутчэй псуюцца адносіны з партнёрам. Дзейнічае закон псіхалогіі: калі на цябе нехта бяжыць, узнікае толькі адно жаданне — уцякаць. На ўсякі выпадак. Ці мала з чым на нас бягуць...

Па вялікім рахунку, сямейнае жыццё — гэта гульня. Хоць бы і ў даганялкі. Толькі такія, калі то мы даганяем, то нас... З дапамогай гульні, у якой час ад часу мяняюцца правілы, можна дабівацца пазітыўнага выніку і пазбягаць канфліктаў. Бярыце на ўзбраенне псіхалогію. Той жа паводзінавы падыход. Згодна з ім, у партнёра варта падмацоўваць патрэбныя нам паводзіны. Возьмем усю нашу рэакцыю на ўчынкі партнёра за 100 працэнтаў. Дык вось, калі ён зрабіў што-небудзь добрае, то на нашу рэакцыю трэба аддаць 80 працэнтаў, а на адмоўную... 20. Трэба бачыць станоўчае.

А яшчэ — дакладна выказвацца. Абстрактныя жаночыя намёкі, недасказанасць, цьмянасць выразаў мужчыны не ўспрымаюць і з лёгкасцю ігнаруюць. Іншая справа — фраза, у якой закладзена пэўная карысць: «Калі б ты мне зараз дапамог, мы б пасля разам паглядзелі тэлевізар». Трэба прымяняць пазітыўную матывацыю, а не прынцып пакарання, калі ўключаецца абарончы механізм (у псіхалогіі вядома 11 механізмаў абароны!), нежаданне партнёра нават з месца зварухнуцца.

**P.S.** ***Карыстайцеся ведамі спецыялістаў. Вучыцеся сямейнай навуцы, і будзе вам сямейнае шчасце!***

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### 22 июня 2010 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение – строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды, (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Мазурова | 340100000001003288 | 2,7581 | культурно-развлекательного оздоровительного центра «Аквапарк». | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водоохранная зона оз. Бурое Болото – 0,0811 га; водоохранная зона оз. Бурое Болото – 1,7335 га; прибрежная полоса оз. Бурое Болото – 0,9435 га | 99 | 2 441 250 | 1 311 733 290 | 130 000 000 |
| 2 | ул. Добрушская | 340100000008001613 | 0,4505 | станции техобслуживания | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0168 га; водопровода – 0,0163 га. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории | 50 | 2 532 588 | 29 361 690 | 2 900 000 |
| 3 | пр-зд Орудийный (участок № 1) | 340100000007004921 | 0,5381 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0128 га | 99 | 587 480 | 43 321 770 | 4 300 000 |
| 4 | пр-зд Орудийный (участок № 2) | 340100000007004920 | 0,8016 | объектов экологически чистого производства | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,006 га | 99 | 377 654 | 64 534 460 | 6 400 000 |
| 5 | ул. Текстильная | 340100000003001800 | 0,6789 | здания многофункционального назначения (станция техобслуживания, салон автомобилей, офисный центр, торговый центр с промышленной группой товаров). | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,1460 га; охранная зона водовода – 0,0310 га. Выполнить технические условия по выноске КЛ и водовода. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории | 99 | 581 818 | 349 589 290 | 34 900 000 |
| 6 | ул. Мазурова (участок № 1 и участок № 2) | 340100000001004200<br>340100000001004201 | 0,1189<br>0,0377 | оздоровительного центра (медицинские услуги, парикмахерская, фотоуслуги, ателье, цветочный магазин) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: участок № 1 – охранная зона канализации – 0,0038 га, охранная зона подземной кабельной линии связи, подземной кабельной линии электропередачи – 0,0196 га; участок № 2 – охранная зона канализации – 0,0042 га | 99 | 624 661 | 89 923 009 | 8 990 000 |
| 7 | ул. Дорожная (в районе пешеходного моста) | 340100000008001760 | 0,0790 | павильона по оказанию услуг населению (резка стекла). | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи и водопровода – 0,0227 га | 5 | 923 705 | 2 523 750 | 250 000 |
| 8 | ул. Чечерская | 340100000002004625 | 0,0305 | здания специализированного здравоохранения и предоставления социальных услуг (аптека) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы – 0,0040 га | 50 | 1 020 365 | 4 445 550 | 440 000 |
| 9 | ул. Чечерская | 340100000001004505 | 0,0498 | здания специализированного для обслуживания населения (парикмахерская, мастерская) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Земель с ограничением в использовании нет | 50 | 1 113 210 | 9 329 320 | 930 000 |
| 10 | ул. Речицкое шоссе, в районе котельной и жилого дома № 27 | 340100000006004172 | 0,0137 | павильона по оказанию услуг населению | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализации, теплотрассы, электрокабеля – 0,0048 га | 10 | 1 545 604 | 1 523 830 | 150 000 |
| 11 | ул. Лепешинского – проезд Инженерный | 340100000002002626 | 0,1639 | производственной базы | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ – 0,097 га | 50 | 1 194 160 | 34 296 050 | 3 400 000 |
| 12 | ул. Нижнебрилевская | 340100000004001161 | 0,0300 | магазина продовольственных товаров | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона напорной канализации – 0,0006 га | 50 | 551 580 | 4 129 820 | 412 000 |
| 13 | ул. Кожара (в районе жилого дома № 6) | 340100000001004653 | 0,0583 | здания специализированного для общественного питания (кафе) | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона водопровода – 0,0216 га | 25 | 1 916 400 | 17 763 236 | 1 770 000 |
| 14 | пересечение улиц Речицкое шоссе и Междугородняя | 340100000006004245 | 0,0036 | установка рекламного светодиодного экрана | | участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0007 га | 5 | 1 253 905 | 413 955 | 41 000 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. Аукцион состоится **22 июня 2010 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того, представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 16 июня 2010 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by.**



Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
**28 мая 2010 года**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже административного помещения с инв. номером 500/D-70772989 общей площадью 68 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58, пом. 138.**

Начальная цена – 295 763 000 белорусских рублей.

Собственник помещения – СООО «Столичный центр». На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 29 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **28 мая 2010 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 14.05.2010 по 26.05.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск).**



**Утерянные страховые полисы** по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН серии ПТ №№ 0349633, 0349634, 0349635 ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными**.

Частка першая

Этнаскарбонка

# ЧАМУ ЗНІКАЕ БЕЛАРУСКАЕ АБЛІЧЧА ГАРАДОЎ?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

## Драўляны радок у масіве мураванага горада

Праблемы захавання помнікаў архітэктуры — балючае пытанне для **дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, доктара архітэктуры, доктара гістарычных навук Аляксандра ЛАКОТКІ**. Яшчэ ў 80-х гадах ён пачаў гаварыць пра неабходнасць захавання драўляных прадмесцяў Мінска. Але адсутнасць пэўнай заканадаўчай базы, неразуменне ролі помнікаў як гісторыка-культурнай каштоўнасці прывяло да таго, што ўнікальныя будынкі, якія сёння маглі стаць нашай адметнай прапановай для турыстаў, разбураліся. Паступова зніклі Камароўка, Старажоўка, Няміга. Гістарычнае асяроддзе горада проста сціралася падчас новабудоўляў, дамы разбіраліся і вывозіліся пад дачы, «дзякуючы» ініцыятыве ўласнікаў пераўтвараліся ў нейкія новыя збудаванні — абрасталі прыбудовамі, абкладаліся цэглай, саступалі месца двухпавярховым катэджам... А сёння мы можам страціць апошнія гістарычныя аб'екты, якія б маглі расказаць пра жыццё старога Мінска. І такая праблема актуальная для ўсіх гарадоў Беларусі.

Сядзіба Залессе (музей А. Міцкевіча), кан. XVIII стагоддзя, Баранавіцкі раён.



## Разбурэнне Гардарыкі

— Драўляная спадчына — адзін з тых складнікаў нашай нацыянальнай культуры, які спрадвеку вызначаў аблічча асяроддзя існавання ўсіх славянскіх народаў. Нездарма вядомы мастацтвазнавец І. Грабар некалі казаў, што Русь (маючы на ўвазе ўсё ўсходняе славянства) — гэта краіна дойлідаў. Скандынаўскія вікінгі назвалі край Драўляных гарадкоў і гарадзішчаў вельмі рамантычна, прыгожа — Гардарыка. Увогуле культура дрэва для славянскіх народаў абсалютна істотная і натуральная (гэтак жа як мураваныя будынкі для горных краін, дзе натуральны такі матэрыял як камень). Яшчэ на пачатку XX стагоддзя абсалютную большасць забудовы нашых гарадоў складалі драўляныя будынкі, — заўважае Аляксандр Лакотка.

Горад нагадвае жывы арганізм. Як з часам дрэва прырастае гадавымі кольцамі, так Мінск прырастаў драўлянымі прадмесцямі: Траецкае, Ракаўскае, Камароўка, Старажоўка, Пярэспы, Кашары, Ляхаўка, Уборкі, Добрыя мыслі, Грушаўка, Кальварыйскае, Татарская вуліца. Увесь час адбываецца аднаўленне «тканак», і старыя забудовы замяняюцца больш сучаснымі. Каб захаваць адметнасць старога горада, абазначыць яго гістарычную прастору знакавымі элементамі, навукоўцы прапаноўвалі пакінуць у кожным з прадмесцяў хаця б тры-чатыры гістарычныя драўляныя збудаванні. З адпаведнай праектнай прапановай Аляксандр Іванавіч выступаў яшчэ ў 1987 годзе — ён прапаноўваў стварыць спіс помнікаў драўлянай архітэктуры Мінска. Узнятае вучоным пытанне не вырашана яшчэ і зараз. І з таго часу многія помнікі драўлянай архітэктуры былі наўпрост знішчаныя. Удалося захаваць адзінкі. Сярод іх дом, які стаяў па Рабкораўскай вуліцы, дзе некаторы час жыў Змітрок Бядуля, пасля Максім Багдановіч, сюды наведваліся Галубок, Фальскі, Чарвякоў. Будынак па вуліцы Вызвалення, які мог знікнуць падчас будаўніцтва другой лініі метро быў перавезены ў музей народнай архітэктуры і побыту. Адрэстаўраваны дом Ваньковіча. З саміх жа прадмесцяў на сёння больш-менш прыдатныя для музеефікацыі засталіся толькі Паўночны завулак. Тут захаваўся шэраг вельмі прыстойных будынкаў з пункту гледжання архітэктуры, і начынне (кафляныя печы, мэбля, рэчы гарадскога побыту пачатку XX стагоддзя). І, на думку Аляксандра Іванавіча, хаця б гэтыя драўляныя радкі ў масіве мураванага горада трэба захаваць. Жыхары завулка ў свой час былі захопленыя ідэяй стварэння тут музейнай вуліцы. Між іншым, у замежжы ўласнікі, якім належаць падобныя будынкі, абавязаны трымаць іх у прыстойным стане, рэстаўраваць і паказваць турыстам. Гэта стымулюецца дзяржавай, пад гэтую справу выдаткоўваюцца грошы.

Многім сталічным прадмесцям, асабліва ў апошні дзясятак гадоў, менавіта іх жыхары падпісалі «смяротны прыгавор».

— Калі б дамы захоўвалі сваё першапачатковае аблічча, можна было б яшчэ ўздымаць пытанне пра неабходнасць захавання фрагментаў традыцыйна-гістарычнай драўлянай забудовы Мінска. Але сёння ўжо няма на што глядзець. Калі ў прыватным сектары набудавана невядома чаго, дык пры будаўніцтве сучасных вуліц усё будзе зносіцца падчыстую. Для прыкладу: будуецца метро на Міхалава, Пятроўшчыну, Паўднёвы захад. Пэўная частка былога Грушаўскага прадмесця ўжо знесеная і тое ж будзе з астатняй. Праўда, сярод будынкаў гэтага прадмесця ёсць сапраўды цікавыя і ўнікальныя, датаваныя 1918, 1902, 1901 гадамі, быў знойдзены нават адзін дом сярэдзіны 19 стагоддзя. Ёсць цікавыя дамы 20-х гадоў, пабудаваныя ў стылі канструктывізму, адзін з іх цяпер літаральна дажывае апошнія гадзіны — побач стаяць краны... Я лічу, што ў любым комплексе, у любым атачэнні можна захаваць 1, 3, 5 унікальных драўляных забудоў — як малыя архітэктурныя формы. Іх можна смела паказваць турыстам, таму што ўсё гэта сапраўднае, старажытнае. Так робіцца, напрыклад, у Варшаве. Прыклады можна прывесці па розных краінах: Балгарыі, Румыніі, у Славакіі наогул некаторыя горныя вёскі цалкам і жывуць дзякуючы турызму. Наогул усе гэтыя пытанні (і з захаваннем дамоў, і з выкупам у мясцовых жыхароў) можна вырашыць. Але гэта праблема нашай культуры, нашага сумлення.

Прынамсі, калі помнікі драўлянай архітэктуры немагчыма пакінуць на месцы, ёсць і іншыя шляхі для іх выратавання.

## Навадзел ці аўтэнтычныя будынкі?

У раёне Чыжоўкі плануецца стварыць горад майстроў з карчмой, сувенірнымі крамамі, домам друкара і іншымі будынкамі. Вось толькі ці будзе гэты горад майстроў сапраўдным. Пакуль яго плануецца ствараць з навадзелу. Ці не з'явіцца тут яшчэ адна пляцоўка ў псеўданародным стылі, хвалюецца Аляксандр Лакотка, узгадваючы «лялечныя» домікі з ацыліндраванай драўніны Мазырскага замка і Буйнічаў, не падобныя на народнае жытло, штучна зробленыя, а мо яшчэ і з надпісам на даху кшталту «карчма»:

— На жаль, такая практыка зараз прымаецца ў розных беларускіх гарадах. Сёння міністр культуры Павел Латушка клапоціцца пра неабходнасць пазіцыянаваць культуру Беларусі ў еўрапейскім і сусветным маштабе і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. А што мы збіраемся пазіцыянаваць? Дзіцячыя пляцоўкі павялічаных памераў? Гэта смешнае відовішча, прымітывізм, гэта ганьбіць тое адмысловае майстэрства, якім валодалі нашы цесляры, разьбяры, якія працавалі на многіх сусветнавядомых аб'ектах,напрыклад, у Маскве, у Новадзявочым манастыры, Каломенскім і г.д.

У той жа час помнікі драўлянай архітэктуры, якія сапраўды маглі б прадстаўляць нашу краіну, быць цікавымі замежнаму турысту, могуць проста знікнуць. Аляксандр Іванавіч прапаноўвае замест навадзелу, штучных утварэнняў паставіць у Чыжоўцы аўтэнтычныя пабудовы. Шмат старых драўляных будынкаў, якія, відаць, чакае лёс зніклых сталічных прадмесцяў, захавалася ў Бабруйску, Гомелі, Віцебску, Гродне, Магілёве. Чаму б іх не перавесці сюды і не стварыць, напрыклад, сапраўдны парк драўляных прадмесцяў гарадоў Беларусі? Напрыклад, у Оршы па вуліцы Пралетарская, 12, захавалася карчма пачатку XX стагоддзя з цудоўнымі кафлянымі печкамі (кафля рабілася на славутай у свой час у Расійскай імперыі фабрыцы ў Копысі), ёсць кафляныя выявы партрэтаў славутых рускіх пісьменнікаў. У той жа самай Оршы на вуліцы Мінскай ёсць цікавыя пабудовы з адмысловай барэльефнай, вельмі рэдкай для Беларусі, разьбой. Цудоўныя стогадовыя пабудовы з выдатнай разьбой захаваліся ў Гомелі. У Бабруйску на вуліцы Інтэрнацыянальнай, 11 шыкоўны драўляны асабняк у стылі мадэрн знаходзіцца ў непрыглядным стане... І такіх будынкаў можна «назбіраць» для стварэння падобных турыстычных праектаў многіх гарадоў альбо для развіцця аграгурызму. Але чамусьці пакуль сапраўдная спадчына застаецца незапатрабаванай. І мы прапагандуем не тое, чым можам быць адметнымі на міжнародным турыстычным рынку, не тое, што стваралі беларускія дойліды. На жаль, пакуль аграгурызм па-беларуску — гэта хутчэй толькі здабыванне грошаў, а не пазіцыянаванне беларускай культуры.



**Народная разьба пачатку XX стагоддзя, вёска Юзэфавічы, Барысаўскі раён. Хіба ўбачыш такое ў сучасных аграсядзібах?**

## Скансэн

У той жа час музей народнай архітэктуры і побыту (такія музеі ў свеце называюцца скансэнамі) застаецца недабудаваным. Гэта прытым, што ідэя аб яго стварэнні ў Беларусі ўзнімалася яшчэ перад Другой сусветнай вайной. Але толькі ў канцы 60-ых—пачатку 70-ых гадоў, калі ва ўмовах распрацоўкі дактрын неперспектыўных паселішчаў, ва ўмовах харчовай праграмы і іншых маштабных амбіцыйных аграрных праграм стала зразумела, што народная архітэктурная і гісторыка-культурная спадчына можа знікнуць, вядомыя мастакі, пісьменнікі, культурныя і грамадскія дзеячы звярнуліся да ўрада рэспублікі з прапановай стварыць беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.

— Сёння, калі ідэі развіцця аграгурызму такія папулярныя, калі мы гаворым пра прагматычныя напрамкі эканомііі, пра інвестараў, варта нарэшце паспрабаваць давесці гэтую справу стварэння скансэна да завяршэння, — заўважае Аляксандр Лакотка. — Гэта можна зрабіць некалькімі шляхамі. Адзін (і найбольш рэальны) шлях, паколькі ў музеі прадстаўляюцца ўсе вобласці Беларусі, даручыць кожнай вобласці стварыць тыя тры-чатыры сядзібы, якія неабходныя для экспазіцыі. Думаецца, што для вобласці гэта не стала б нейкай фінансавай істотнай праблемай, на фоне таго як спантанна, безгустоўна, эклектычна і не заўсёды навукова абгрунтавана ўзнікаюць аграгурыстычныя сядзібы ці нейкія надуманыя, лялечныя, відовішчныя турыстычныя пункты, якія часта скажаюць сапраўднае аблічча нашай народнай культуры.

Другі шлях — прыцягненне інвестараў. Трэба памятаць, што беларускі скансэн пабудаваны на адмысловай тэрыторыі, святым месцы, якіх няшмат у славянскім свеце. Некалі, калі Пётр Машэраў аб'язджаў наваколлі Мінска на прадмет выбару тэрыторыі для скансэна, яму прапаноўвалі прыгожыя пагоркі Лагойшчыны, маляўнічыя краявіды Мядзельшчыны, але тым не менш ён спыніўся на гэтых мясцінах. Недалёка ад ракі Пціч, якая працякае праз беларускі скансэн, знаходзіцца легендарная рэчка Менка, у якую ўпадае знакаміты ручай Дунай. Захавалася гарадзішча. Шэраг даследаванняў пачатку XX стагоддзя сцвярджае, што менавіта тут узнік Мінск. Пра гэта сведчыць і тая ж «Аповесць мінулых часоў», дзе паведамляецца, што спачатку быў узяты Мінск, а пасля войскі рушылі да Нямігі, дзе адбылася бітва.

Аляксандр Іванавіч неаднойчы выступаў на калегіі Міністэрства культуры з прапановай зрабіць гарадзішча на Менцы прыстойным для турыстычнага наведвання, тым больш што гэта не патрабуе вялікіх выдаткаў. Варта выкасіць траву, прывесці ў парадак кустоўе, высекчы чарналессе, зрабіць аўтастаянку, некалькі пляцовак для назірання — і гарадзішча можа дзейнічаць, як дзейнічаюць усе такія помнікі ў Польшчы. Легендарныя мясціны, з якімі звязана і агульнаславянская назва Дунай, маюць выгаднае месцазнаходжанне (недалёка ад сталіцы, побач з міжнароднай трасай Масква—Брэст, праходзяць праз турыстычны маршрут Усход—Захад). Гарадзішча магло б стаць месцам правядзення пэўных усходнеславянскіх фестываляў, агульнаславянскіх культурных мерапрыемстваў.

— Калі мы гаворым пра месца Беларусі ў Еўропе, месца ў славянскім свеце, то завяршэнне будаўніцтва скансэна ў такім месцы сёння надзвычай актуальнае, — заўважае Аляксандр Лакотка.

**Дом пачатку XX стагоддзя, г. Клімавічы. Чым не прынада для турыстаў?**





**Дом пачатку XX стагоддзя, г.Бабруйск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11. Гэты драўляны асабняк у стылі мадэрн мог бы аздобіць любы музей народнай архітэктуры.**



**Сядзіба Лошыца, пачатак XX стагоддзя, г. Мінск.**


## РЕЗУЛЬТАТЫ РОЗЫГРЫША ПРИЗОВ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «БОНУС - Минск»

**Организатор рекламной игры** – Республиканское унитарное предприятие по организации лотерей «Национальные спортивные лотереи» (зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 1252 от 18.11.1999 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190033145).

**Место нахождения организатора:** 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 49, комн. 315. УНП – 190033145.

**Наименование рекламной игры** – «Бонус-Минск». Свидетельство о государственной регистрации Правил проведения рекламной игры № 1657 от 30.03.2010 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Место проведения** – букмекерские кассы по адресам: г. Минск, ул. Кульман, 9, сектор 12, места 7, 8; г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 21 (ТЦ Галерея), пав. № 99; г. Жодино, пр-т Ленина, 21, корп. 2, пом. 8, ком. 4. **Срок проведения рекламной игры** «Бонус-Минск» – с 03.04.2010 года по 15.05.2010 года.

**Общая сумма призового фонда** рекламной игры составляет **1 500 000 (Один миллион пятьсот тысяч) белорусских рублей: 3 приза по 500 000 (пятьсот тысяч) рублей.**

**Розыгрыш призового фонда** рекламной игры проводился 1 мая 2010 года в 10.00 по адресу букмекерской кассы: г. Минск, ул. Кульман, 9, сектор 12, места 7, 8, в 14.00 по адресу букмекерской кассы: г. Жодино, пр-т Ленина, 21, корп. 2, пом. 8, ком. 4, в 17.30 по адресу букмекерской кассы: г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 21 (ТЦ Галерея), пав. № 99, в присутствии членов Комиссии и участников рекламной игры, изъявивших желание присутствовать на розыгрыше.

В результате финального розыгрыша, в котором участвовало 443 купона в кассе г. Минск, ул. Кульман, 9, сектор 12, места 7, 8, 148 купонов в букмекерской кассе г. Жодино, пр-т Ленина, 21, корп. 2, пом. 8, ком. 4, 231 купон в букмекерской кассе г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 21 (ТЦ Галерея), пав. № 99 определены следующие победители (Протокол заседания комиссии по рекламной игре «БОНУС - Минск»):

**г. Минск –**
**приз 500 000 Шамшорик Т.Н. (купон № 0036841)**
**г. Солигорск –**
**приз 500 000 Тамило С.В. (купон № 003646)**
**г. Жодино –**
**приз 500 000 Стаховский И.А. (купон № 0037460)**

Телефон справочной службы УП «Национальные спортивные лотереи» **(017) 288 20 55, (029) 388 20 55,** сайт **www.superloto.by.**

Условия проведения рекламной игры публиковались 01.04.2010 в газете «Звязда».

*УП «Национальные спортивные лотереи» УНП 190033145.*
*Тэл. (017) 288 20 55. Лиц. № 02200/0040499 МФ РБ 10.11.2009/08.12.2014.*


Экслібрыс «Звязды»

# ЖОРНЫ ГІСТОРЫІ

***Ждан, О.А.***
***Князь Мстиславский: роман/ Олег Ждан. — Минск: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 256 с. — (Свет минувшего).***

Лёс князя Жэслаўскага з XVI стагоддзя — далёкая ад нас гісторыя. Дарэчы, зусім не гераічная, а хутчэй — драматычная. Гісторыя, якой складана выставіць і адмоўную адзнаку. Міхаіл Жэслаўскі, нашчадак слаўнага княжацкага роду, патрапіў у няпростую сітуацыю. Законны жыхар Мсціслава, зацверджаны самім Вялікім князем Літоўскім Аляксандрам, аказаўся перад жорсткім выбарам. У горадзе — сотні паўтары ратнікаў, 20 бочак пораху ды іншая невялікая драбяза, якую можна скарыстаць для абароны, а маскоўскае войска смела размясцілася за ракою ў чаканні лёгкай спажывы. Непрыяцель прапаноўвае мірную здачу горада. Якое прыняць рашэнне, калі і на дапамогу разлічваць не даводзіцца?.. Жэслаўскі запускае праціўніка ў горад, цалуе крыж, прысягаючы ў вернасці маскоўскаму цару. А праз некаторы час, пасля разгрому маскоўскіх войскаў дружынай Канстанціна Астрожскага, мсціслаўскі князь піша каралю Польскаму і Вялікаму князю Літоўскаму Сігізмунду І, што здача горада была вымушанай: «мусил то от неволи вчинити», бо як жа было вытрымаць націск сілы шматкрат большай...

Алег Аляксеевіч Ждан, вядомы ў Беларусі празаік, падараваў чытачу магчымасць паразважаць над многімі гісторыка-маральнымі аспектамі даўно мінулых часін. Раман «Князь Мсціслаўскі», якім выдавецтва «Літаратура і Мастацтва» адкрыла новую кніжную серыю «Святло мінулага», з'яўляецца не толькі дынамічным экскурсам у Мсціслаў XVI стагоддзя, але і сведчыць пра настойлівае памкненне пісьменніка паразважаць над вечнымі клопатамі чалавека, над тым, што само па сабе значыць жыццё, якім выпрабаваннем становяцца апошнія, дараваныя Богам і лёсам хвіліны.

Несумненна, раман прыйдзецца даспадобы саламу шырокаму колу чытачоў. Шкада, што тыраж у кнігі і па сённяшнім часе не дужа вялікі — усяго 1600 асобнікаў.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Наш культурны асяродак

# Жырандоля

Выпуск № 6 (92)

Гэта ж мы, Госпадзі...

# НЕПАКОЙЧЫЦЫ ПРОСЯЦЬ СПАКОЮ

Святлана ЯСКЕВІЧ



НІКОЛІ раней за ўсё жыццё не даводзілася быць на зруйнаваных і збэшчаных могілках. Раскапаныя магільныя скляпенні зеўраюць ямамі з пабітай цэглай, вакол ляжаць парушаныя камяні з надпісамі, а на цыратовым мяшку складзены гурбачкай чалавечыя косці... І гэта праз 18 гадоў пасля апошняга глумлення над прахам людзей з дапамогай магутнай тэхнікі і пасля суботніка, на якім група энтузіястаў распачала работу па прывядзенні ў парадак фамільных могілак паноў Райскіх ва ўрочышчы Непакойчыцы, што пад Жабінкай.

Аўтару гэтых радкоў даводзілася чуць жудаснаватыя гісторыі пра тое, як здзекаваліся са шкілетаў, павыцяганых з Закозельскай капліцы Ажэшкаў, як білі і трушчылі прыгожыя творы рук чалавечых у іншых месцах, але каб так, на свае вочы — упершыню. Стоячы на гэтых знявечаных могілках, пачынаеш разумець няўмольную логіку шматлікіх прадказальнікаў канца свету. Што мае адбыцца з людзьмі, каб яны пайшлі супраць спрадвечных законаў чалавечага існавання? Тым больш што паважлівае стаўленне да месцаў спачыну спрадвеку культывавалася продкамі, падтрымлівалася ўсімі рэлігіямі, перадавалася з пакалення ў пакаленне. Кажуць, што вандалы-капальнікі шукалі тут міфічны скарб, панскае золата. Але ж і вожыку зразумела, што людзі, якія з'язджаюць назаўсёды ў іншую краіну, не будуць пакідаць золата ў зямлі. Ды, відаць, каб зразумець гэта, варта мець мазгі, хоць бы як у вожыка. А яшчэ сумленне, чалавечую годнасць. І не толькі тым, хто займаўся такой антычалавечай справай.

Ды пра ўсё па парадку. Як сведчыць гістарычная літаратура, упершыню Непакойчыцы згадваюцца ў Літоўскай метрыцы ў 1513 годзе. Першыя гаспадары сядзібы, якая ўзведзена ў маляўнічай мясціне на беразе Мухаўца, паходзілі з роду Хадкевічаў. Потым маёнтак пераходзіў ад адных гаспадароў да другіх, у розныя часы ім валодалі Здзітавецкія, Залескія, Галецкія, Роскія, а затым Райскія. Апошнія гаспадарылі на тутэйшых землях амаль чатыры стагоддзі. І, як маглі, упрыгожвалі гэтую зямлю. Ёсць звесткі, што ў другой палове XVI стагоддзя ў фальварку ўзвялі пратэстанцкі евангелічны храм, які прастаяў да сярэдзіны мінулага стагоддзя. Пазней, праўда, побач з'явіўся і касцёл. Паны пабудавалі таксама бальніцу для сялян, жыллё для работнікаў. У цэнтры сядзібы стаяў прыгожы панскі дом. Апошні гаспадар Непакойчыцаў Эдвард Райскі і яго жонка Ліза разам з дзецьмі выехалі ў Турцыю ў 1939 годзе. Вядома, ім у сне не магло прысніцца, што давядзецца пакідаць радзіму вось так — па сутнасці, кідацца на ўцёкі. Вякамі свае фамільныя могілкі яны абсталёўвалі ў адпаведнасці са сваёй сістэмай поглядаў і разуменняў. Магіла будавалася ў выглядзе скляпення, а зверху змяшчаўся камень-валун з надпісам. Выглядала велічна і сціпла адначасова. «Спакой яго душы» — высечана на адным з камянёў. Ох, не ведалі гаспадары сядзібы, што ў назве маёнтка закладзены лёс яго.

Усё пачалося ў 1939 годзе. Касцёл быў разбураны і перавезены на будаўніцтва стайні ў вёску Пятровічы. Такая ж доля чакала і старажытны евангелічны храм. Сяляне разабралі і панскія пакоі аж да падмурка. За кароткі час ад сядзібы нічога не засталося. І гэта была не рэдкасць па тым часе. Хутчэй наадварот: большасць сядзібаў напаткаў падобны лёс. Хоць, здавалася б, гатовае памяшканне, дыхтоўнае, прыгожае: зрабі тут санаторый, піянерскі лагер, дом для састарэлых. Некаторыя кіраўнікі новай улады так і дзейнічалі, але, на жаль, нямногія. У большасці ж вылазіў наверх нейкі дзікунскі інстынкт: ламаць, трушчыць і, пэўна, атрымліваць ад гэтага нейкую асалоду. А напаследак яшчэ і патаптацца на касцях.

Бо чорныя капальнікі, як цяпер іх называюць, а па праўдзе, вандалы, развярнулі могілкі, раскапалі магілы, павыварочвалі труны і раскідалі прах па ваколіцы. Але ранейшыя апаганьвальшчыкі месца пахаванняў мелі на ўзбраенні толькі рыдлёўкі. Пазней на змену ім прыйшлі больш падрыхтаваныя, у 1992 годзе на гэтым месцы адбылося сапраўднае дзікунства. Магілы развярнулі з дапамогай магутнай гусенічнай тэхнікі, могілкі спляжылі ўдоўж і ўпоперак. Тагачасны рэдактар жабінкаўскай раённай газеты Антаніна Хакімава пабывала на гэтым месцы. Карціну яна застала жудасную: паўсюль валяліся чалавечыя астанкі, абломкі драўляных дамавін. Антаніна Іванаўна біла ва ўсе званы, але не была пачутая. У сваім вострым, яркім, эмацыйным матэрыяле «Вандалізм ў Непакойчыцах» раённы рэдактар патрабавала знайсці вінаватых і пакараць за здзек над месцам пахавання. Яна прапаноўвала таксама навесці парадак і неяк абазначыць могілкі. Потым хадзіла да кіраўнікоў райвыканкама, гаварыла, прасіла, пераконвала — нічога не дапамагло. Неўзабаве Антаніна Хакімава перайшла на работу ў Брэст, а болей нікому, як відаць, справы не было да гаротных Непакойчыцаў. За 18 гадоў толькі прырода, як магла, загаіла гэтую рану на зямлі. Ямы крыху паменшалі, насыпы зраўняліся, а былыя могілкі густа зараслі хмызняком і рознымі травамі.

Могілкі месцяцца на ўзвышшы, а побач рака Мухавец з дзіўным закручастым рэчышчам. З другога боку — адкрытае месца, дзе была панская сядзіба, ад якой засталіся крыху здзічэлыя яблынькі, зараз залітыя цветам. Крыху паводдаль стаяць клёны, ясень, а таксама частка ліпавай алеі, што акаляла сядзібу. Гэта адна з найпрыгажэйшых мясцінаў Жабінкаўшчыны, якая вылучана ў біялагічны заказнік «Непакойчыцы». Менавіта заказнік спрычыніўся да пачатку работы па выпраўленні наступстваў дзеяння вандалаў мінулага стагоддзя. Начальнік раённай аховы прыроды Сяргей Штык выпадкова заўважыў гэтыя знявечаныя могілкі на тэрыторыі заказніка. Ён і падняў грамадскасць на добраўпарадкаванне лапіка зямлі. У дзень рэспубліканскага суботніка супрацоўнікі райінспекцыі аховы прыроды, землеўпарадкавальнай службы, Пятровіцкага лясніцтва, наколькі магчыма, расчысцілі самі могілкі і падступы да іх уручную. Далей патрабавалася задзейнічаць тэхніку. І за работу ўзялася Жабінкаўская ПМК-10 Брэстаблсельбуда. Работнікі ПМК не толькі расчышчаюць могілкі, але маюць намер і добраўпарадкаваць усю тэрыторыю былога маёнтка Непакойчыцы. Начальнік ПМК-10 Мікалай Шпакоўскі літаральна загарэўся гэтай ідэяй.

— Такіх дзіўных па прыгажосці мясцінаў мала знойдзецца на ўсім Мухаўцы, — гаворыць Мікалай Антонавіч. — Тут рэчышча ракі тры разы паварочваецца. А што датычыць былой сядзібы... Я ледзь не гадзіну хадзіў паміж ліпамі, каб зразумець сістэму, па якой пасаджаны дрэвы, і нарэшце ўцяміў: пасаджаны па тры такім чынам, што кожная тройка ўтварае арку, і тым самым дрэвы загароджваюць ад вятроў. Тут салавей заўжды спявае, белы бэз разросся па ўсёй ваколіцы. Я ўвогуле палю, але тут, ведаеце, не цягне.

Яшчэ Мікалай Шпакоўскі расказаў, што засеў у інтэрнэт у пошуках гісторыі былога маёнтка, але ў сецівe звестак аказалася няшмат, таму замовіў у знаёмага спецыяліста матэрыялы па гэтай тэме. Сапраўды, пабываўшы на руінах раскіданага гнязда Райскіх, цікава даведацца, хто такія яны былі.

Адзін толькі дакумент, які трапіўся ў рукі аўтару гэтых радкоў, шмат чаго прасвятляе. «Завяшчанне» аднаго з гаспадароў Непакойчыцаў, датаванае 1843 годам, перапісаў у Гродзенскім архіве мясцовы гісторык і краязнаўца Анатоль Бензярук. Гэты допіс, што па аб'ёме цягне на невялікую брашуру, уяўляе сабой зусім не ўзор бытавога эпісталярнага жанру, хутчэй гэта публіцыстычны нарыс філасофска-этычнага характару з элементамі ўласна завяшчання. Станіслаў Райскі на рускай мове пушкінскіх часоў выклаў запаветы дабрыні, спагады, добрасуседства, важнасці навукі для «розуму і сэрца» сваім нашчадкам — дзецям, унукам, праўнукам. Цікава, што ў спрэс рускім тэксце часта сустракаецца чыста беларускае словазлучэнне «ласкавы хлеб». Відаць, маецца на ўвазе пенсія, якую гаспадар прызначыў многім сваім слугам — фурману, яго дзецям ды іншым работнікам, а самых здольных з дзяцей чэлядзі гаспадар прадпісваў аддаваць у навучанне. Напрыклад, ён піша так: «Унушаю дзецям маім, што па правілах рэлігіі і маралі заўсёды памяталі пра сваіх карміліц да іх смерці, каб давалі дапамогу ў выпадку неўраджаю, падзяжу жывёлы, клапаціліся падчас хваробы, а ў старасці давалі ласкавы хлеб».



Яблынька з панскага саду.

Пра заснаванне бальніцы, якая дастаяла да 1939 года, Станіслаў вельмі падрабязна распараджаецца ў «Завяшчанні». Гаспадар апісвае ўнутранае ўладкаванне лякарні, дае распараджэнні наконт персаналу, бялізны, харчавання, лекаў і шмат чаго яшчэ. Гаворыцца таксама, што «хворых мая жонка будзе дастаўляць сама і мець пра іх клопат».

Цэлы своеасаблівы раздзел аўтар допісу прысвячае таму, як павінны жыць яго нашчадкі, якімі ідэаламі кіравацца, як пазбягаць дрэнных прыкладаў. Яшчэ Райскі вучыць сыноў, унукаў мірна і памяркоўна вырашаць усе спрэчкі з суседзямі. «З дакументаў вы ўбачыце, — піша ён, — колькі я дзеля спакою ўступіў сквапнаму суседу зямлі». У сваіх разважаннях на тэму адносінаў з людзьмі Станіслаў спасылаецца на нейкія «Гисторіи предков наших». Магчыма, існаваў і такі твор. Нездарма ж у анкеце на пытанне, якімі мовамі свабодна валодае і карыстаецца, аўтар «Завяшчання» пазначыў: руская, польская, французская, нямецкая.

Такія яны былі, Райскія, людзі тутэйшай зямлі. Дваццатае стагоддзе жорстка абышлося з іх родам. І тут ужо нічога не пераменіш. А вось выправіць хоць у нейкай меры грэх папярэднікаў, якія ўчынілі вэрхал на могілках, і тых, хто маўкліва сузіраў кашчунства, сёння прыйшоў час. Такая думка выказвалася многімі людзьмі, з кім давялося гаварыць падчас падрыхтоўкі матэрыялу.

На месцы былых могілак пабываў і святар. Ксёндз Тадэвуш Альшэўскі паабяцаў дапамагчы ў пахаванні чалавечых астанкаў пасля таго, як на могілках будзе наведзены парадак і яны будуць неяк абазначаныя. Цяпер раённыя архітэктары думаюць над тым, як лепей размясціць фрагменты помнікаў, што захаваліся, каб яны сталі адным помнікам былым фамільным могілкам Райскіх.

*Жабінкаўскі раён.*

Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ КОДЭКСЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ УДАСКАНАЛЬВАННЯ ПАРАДКУ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯЎ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 9 красавіка 2010 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 19 красавіка 2010 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2003 г., № 8, 2/922; 2005 г., № 121, 2/1137; 2006 г., № 92, 2/1219; 2008 г., № 184, 2/1508) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У частцы 3 артыкула 27 словы «першай або другой» і «разумовым развіцці, не звязанага з хваравітым псіхічным расстройствам» замяніць адпаведна словамі «1 або 2» і «псіхічным развіцці, не звязанага з псіхічным расстройствам (захворваннем)».

2. У частцы 1 артыкула 28 слова «захворвання» замяніць словамі «расстройства (захворвання)».

3. У частцы 1 артыкула 29 словы «хваравітага псіхічнага расстройства» замяніць словамі «псіхічнага расстройства (захворвання)».

4. Частку 4 артыкула 49 дапоўніць пунктамі 7 і 8 наступнага зместу:

«7) іншаземным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія не пражываюць пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь;

8) асобам, хворым на актыўную форму туберкулёзу.».

5. Пункт 8 часткі 3 артыкула 52 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«8) асобам, хворым на актыўную форму туберкулёзу, якія не маюць пастаяннага месца працы.».

6. У частцы 3 артыкула 54 словы «гарнізоннай гаўптвахце» замяніць словамі «гаўптвахце ваеннай камендатуры».

7. У пункце 6 часткі 5 артыкула 55 словы «хворым на адкрытую» замяніць словамі «асобам, хворым на актыўную».

8. У пункце 14 часткі 1 артыкула 64 слова «захворваннем» замяніць словамі «расстройствам (захворваннем)».

9. У частцы 10 артыкула 80 словы «вызвалення з лячэбна-працоўнага прафілакторыя» замяніць словамі «спынення яго знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі».

10. У артыкуле 92:

у назве артыкула слова «хваробе» замяніць словам «захворванню»;

у частцы 1 словы «псіхічнай хваробай, якая пазбаўляе» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем), якое пазбаўляе»;

у частцы 2 словы «іншай цяжкай хваробай, якая перашкаджае» замяніць словамі «іншым цяжкім захворваннем, якое перашкаджае».

11. У артыкуле 94 словы «цяжкай хваробы» замяніць словамі «цяжкага захворвання».

12. У частцы 5 артыкула 97 словы «цяжкай хваробай» і «першай» замяніць адпаведна словамі «цяжкім захворваннем» і лічбай «1».

13. У частцы 1 артыкула 100 словы «псіхічна хворых» замяніць словамі «асобаў, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў)».

14. У артыкуле 101:

у назве артыкула словы «псіхічна хворым» замяніць словамі «асобам, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў)»;

у абзацы першым словы «псіхічнай хваробай, якая пазбаўляе» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем), якое пазбаўляе»;

у пункце 1 слова «псіхіятра» замяніць словам «урача-псіхіятра».

15. У артыкуле 102:

у частцы 1 словы «псіхіятра» і «псіхічна хворага, які» замяніць адпаведна словамі «ўрача-псіхіятра» і «асобы, якая пакутуе ад псіхічнага расстройства (захворвання), якое»;

у частках 2 і 4 словы «псіхічна хворага, які» замяніць словамі «асобы, якая пакутуе ад псіхічнага расстройства (захворвання), якая»;

у частцы 3 словы «псіхічна хворага, які ўчыніў» замяніць словамі «асобы, якая пакутуе ад псіхічнага расстройства (захворвання), якая ўчыніла».

16. У артыкуле 103:

у частцы 1 словы «псіхічна хворым» замяніць словамі «асобам, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў),»;

у частцы 2 словы «Усе псіхічна хворыя» замяніць словамі «Асобы, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў)»;

у частцы 4 словы «псіхічна хворы» і «органы аховы здароўя» замяніць адпаведна словамі «асоба, якая пакутуе ад псіхічнага расстройства (захворвання),» і «ўпраўленні аховы здароўя абласных выканаўчых камітэтаў, камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта».

17. У артыкуле 104 словы «псіхічнай хваробай, якая пазбаўляе» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем), якое пазбаўляе».

18. У артыкуле 106:

у частцы 1 словы «псіхічнай хваробай» замяніць словамі «псіхічным расстройствам (захворваннем)»;

у частцы 2 словы «першай» і «псіхіятра» замяніць адпаведна лічбай «1» і словамі «ўрача-псіхіятра».

19. У абзацы першым часткі 1 артыкула 135 слова «медыцынскага» замяніць словамі «медыцынскіх работнікаў».

20. У абзацы першым часткі 1 артыкула 147 словы «псіхічную хваробу» замяніць словамі «псіхічнае расстройства (захворванне)».

21. У абзацы першым часткі 2 артыкула 157 словы «гэтай хваробы» замяніць словамі «гэтага захворвання».

22. У артыкуле 158:

у назве артыкула словы «венерычнай хваробай» замяніць словамі «венерычным захворваннем»;

у абзацы першым часткі 1 і абзацы першым часткі 2 словы «венерычнай хваробай» і «гэтай хваробы» замяніць адпаведна словамі «венерычным захворваннем» і «гэтага захворвання».

23. У абзацы першым часткі 2 артыкула 159, абзацы першым часткі 2 артыкула 435, абзацы першым часткі 2 артыкула 436 і абзацы першым часткі 1 артыкула 447 слова «хвароба» замяніць словам «захворванне» ў адпаведным склоне.

24. У артыкуле 161:

назву артыкула і абзац першы часткі 1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 161. Неаказанне медыцынскай дапамогі хворай асобе**

1. Неаказанне медыцынскай дапамогі хворай асобе без уважлівых прычын медыцынскім работнікам альбо іншай асобай, абавязанай аказваць яе ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, —»;

абзац першы часткі 2 слова «хворага» замяніць словамі «хворай асобы».

25. У абзацы першым часткі 1 артыкула 445 і абзацы першым часткі 1 артыкула 446 словы «лячэбнай установы» замяніць словамі «арганізацыі аховы здароўя».

**Артыкул 2.** Унесці ў Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 2000 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 32, 2/140; 2003 г., № 8, 2/922, 2/932; 2006 г., № 92, 2/1219; 2008 г., № 3, 2/1396; № 14, 2/1412; № 184, 2/1508; 2009 г., № 171, 2/1589) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У артыкуле 10:

з часткі 4 словы «па абароне праvоў і свабод чалавека» выключыць;

дапоўніць артыкул часткай $6^1$ наступнага зместу:

«$6^1$. Асуджаныя маюць права на заняткі фізічнай культурай і спортам.».

2. У частцы 7 артыкула 14, артыкулах 142, 144 і 145 словы «гарнізонная гаўптвахта» замяніць словамі «гаўптвахта ваеннай камендатуры» ў адпаведных склоне і ліку.

3. У артыкуле 15 словы «па яго выбары» замяніць словамі «на падставе яго пісьмовай заявы».

4. У артыкуле 16:

у частцы 1 словы «псіхічна хворых» замяніць словамі «асобаў, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў),»;

у частцы 4 словы «псіхічна хворым» замяніць словамі «асобай, якая пакутуе ад псіхічнага расстройства (захворвання),»;

у частцы 5 словы «першай і другой» і «адкрытай» замяніць адпаведна словамі «1 і 2» і «актыўнай».

5. Частку 2 артыкула 24 пасля слова «работы» дапоўніць словамі «, канікул на працягу навучальнага года».

6. Артыкул 35 дапоўніць словамі «, аб змяненні месца жыхарства».

7. У артыкуле 39:

у частцы 4 слова «хваробы» замяніць словам «захворвання»;

у пункце 2 часткі 6 словы «хваробы, выкліканай» замяніць словамі «захворвання, выкліканага».

8. У частцы 2 артыкула 41:

пасля слоў "платы па" дапоўніць частку словам «асноўным»;

другі сказ выключыць.

9. У артыкуле 44:

у частцы 1 словы «, як правіла, у межах вобласці па месцы пастаяннага жыхарства або асуджэння» замяніць словамі «з улікам умоў, неабходных для іх выпраўлення, забеспячэння бяспекі і прадухілення ўчынення імі новых злачынстваў»;

частку 2 выключыць.

10. У частцы 5 артыкула 45 словы «пад канвоем альбо ў суправаджэнні» замяніць словамі «ў парадку, які вызначаны Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

11. У частцы 3 артыкула 46, частцы 3 артыкула 58, частцы 2 артыкула 72 і частцы 2 артыкула 147 слова «хвароба» замяніць словам «захворванне» ў адпаведным склоне.

12. Пункт 4 часткі 3 артыкула 47 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4) пражываць, як правіла, у жылых памяшканнях папраўчай установы адкрытага тыпу і не пакідаць папраўчую ўстанову адкрытага тыпу без дазволу адміністрацыі гэтай установы;».

13. У артыкуле 48:

у частцы 2 слова «інтэрнатах» замяніць словамі «жылых памяшканнях»;

дапоўніць артыкул часткай $2^1$ наступнага зместу:

«$2^1$. Норма жылой плошчы на аднаго асуджанага ў папраўчай установе адкрытага тыпу не можа быць менш як тры квадратныя метры. Кошт камунальна-бытавых паслуг, што аказваюцца, пакрываецца асуджанымі штомесяц у межах фактычных затрат, зробленых у гэтым месяцы, у парадку, што вызначаны Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.».

14. У артыкуле $48^1$:

у пункце 4 часткі 2 словы «крымінальна-выканаўчай інспекцыі» замяніць словамі «супрацоўнікаў органаў унутраных спраў»;

частку 3 дапоўніць пятым і шостым сказамі наступнага зместу: «Асуджанаму, які навучаецца завочна ва ўстанове адукацыі Рэспублікі Беларусь, крымінальна-выканаўчай інспекцыяй можа быць дазволены выезд для здачы экзаменацыйнай сесіі на падставе выкліку ўстановы адукацыі з ускладаннем на асуджанага абавязку зарэгістравацца ў тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў па месцы знаходжання. Па хадайніцтве наймальніка, у якога працуе асуджаны, крымінальна-выканаўчай інспекцыяй можа быць дазволены выезд у службовую камандзіроўку з ускладаннем на асуджанага абавязку зарэгістравацца ў тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў па месцы знаходжання.».

15. У артыкуле 49:

у частцы 1 слова «Лячэбна-прафілактычная» замяніць словам «Медыцынская»;

у частцы 2 словы «Стацыянарнае і амбулаторнае аказанне медыцынскай дапамогі» замяніць словамі «Аказанне медыцынскай дапамогі ў стацыянарных і амбулаторных умовах».

16. У артыкуле 55:

у частцы 1:

слова «Парушэннем» замяніць словам «Парушэннямі»;

пасля слова «свабоды» дапоўніць частку словамі «з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу»;

дапоўніць артыкул часткай $1^1$ наступнага зместу:

«$1^1$. Парушэннямі парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу з'яўляюцца невыкананне асуджаным ускладзеных на яго абавязкаў, парушэнне працоўнай дысцыпліны і грамадскага парадку.»;

у пункце 3 часткі 2 слова «інтэрнат» замяніць словамі «папраўчая ўстанова адкрытага тыпу»;

дапоўніць артыкул часткай $4^1$ наступнага зместу:

«$4^1$. Кошт харчавання і камунальна-бытавых паслуг, што аказваюцца асуджаным, змешчаным у ізалятар часовага ўтрымання органа ўнутраных спраў у парадку дысцыплінарнай ізаляцыі, пакрываецца асуджанымі па фактычных затратах у поўным памеры ў парадку, што вызначаны Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.»;

частку 8 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«8. Пры затрыманні асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу ён накіроўваецца да месца адбывання пакарання ў парадку, вызначаным Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.».

17. Частку 5 артыкула 56 пасля трэцяга сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «На асуджаных да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу пакаранне накладаецца не пазней як праз трыццаць сутак з дня выяўлення парушэння.».

18. Частку 1 артыкула 57 пасля слова «ўстановы» дапоўніць словамі «ва ўзаемадзеянні з тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў».

19. У частцы 5 артыкула 59 словы «цяжкая хвароба» і «якая пагражае» замяніць адпаведна словамі «цяжкае захворванне» і «якое пагражае».

20. Артыкул 61 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 61. Меры заахвочвання і пакарання, якія прымяняюцца да асуджаных да арышту, і парадак іх прымянення**

1. За добрыя паводзіны да асуджаных могуць прымяняцца наступныя меры заахвочвання:

1) аб'яўленне падзякі;

2) датэрміновае зняцце раней накладзенага пакарання;

3) дазвол на тэлефонную размову працягласцю да пятнаццаці хвілін з аплатай з асабістых сродкаў асуджанага.

2. За парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання да асуджаных могуць прымяняцца наступныя меры пакарання:

1) вымова;

2) змяшчэнне ў штрафны ізалятар на тэрмін да дзесяці сутак.

3. Меры заахвочвання і пакарання, якія прымяняюцца да асуджаных, аб'яўляюцца пастановамі службовых асобаў, якія маюць права на іх прымяненне.

4. Меры заахвочвання, за выключэннем датэрміновага зняцця раней накладзенага пакарання, прымяняюцца, калі асуджаны не мае пакаранняў.

5. Датэрміновае зняцце раней накладзеных пакаранняў ажыццяўляецца па чарзе, пачынаючы з першага непагашанага пакарання.

6. Датэрмінова здымаць пакаранні з асуджанага маюць права службовыя асобы, якія наклалі пакаранне, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы.

7. Датэрміновае зняцце накладзенага пакарання дапускаецца, як правіла, не раней:

1) пятнаццаці сутак з дня накладання пакарання, названага ў пункце 1 часткі 2 гэтага артыкула;

2) аднаго месяца з дня адбывання пакарання, названага ў пункце 2 часткі 2 гэтага артыкула.

8. Пры прымяненні да асуджанага мераў пакарання ўлічваюцца акалічнасці ўчынення парушэння, асоба асуджанага і яго папярэднія паводзіны. Пакаранне, якое накладваецца, павінна адпавядаць цяжкасці і характару парушэння. Не дапускаецца за адно парушэнне накладаць некалькі пакаранняў. За некалькі парушэнняў, учыненых аднachасова або на працягу адных сутак, можа накладацца адно пакаранне.

9. Пакаранне накладаецца не пазней як праз дзесяць сутак з дня выяўлення парушэння, а калі ў сувязі з парушэннем праводзілася праверка, — з дня яе заканчэння, але не пазней як праз трыццаць сутак з дня ўчынення парушэння. Пакаранне выконваецца неадкладна, а ў выпадку немагчымасці неадкладнага выканання — не пазней як праз пятнаццаць сутак з дня яго накладання.

10. Асуджаны не можа быць падвергнуты пакаранню, не атрымаўшы магчымасці выказацца і даць пісьмовае тлумачэнне ў сваё апраўданне. Службовыя асобы, якія прымяняюць да асуджаных меры пакарання, павінны ўсебакова і поўна ўлічваць акалічнасці ўчынення парушэння, ступень віны асуджанага, яго апраўданні і накладаць пакаранне пасля асабістай гутаркі з ім.

11. Змяшчэнне асуджаных у штрафны ізалятар ажыццяўляецца з указаннем тэрміну ўтрымання ў ім.

12. Прымяненне меры пакарання ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар ажыццяўляецца толькі пасля агляду асуджанага ўрачом, які павінен пісьмова пацвердзіць, што асуджаны здольны перанесці такое пакаранне. Урач штодзень наведвае асуджаных, якія адбываюць названае пакаранне. Ён абавязаны неадкладна паведамляць пісьмова начальніку арыштнага дома або начальніку ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы, на тэрыторыі якой размешчаны арыштны дом, аб неабходнасці прыпынення выканання гэтага пакарання па прычыне фізічнага або псіхічнага стану асуджанага.

13. Выкананне пакарання ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар прыпыняецца і аднаўляецца па медыцынскіх паказаннях рашэннем службовай асобы, якая наклала такое пакаранне. Пры гэтым гэтая службовая асоба мае права скараціць астатні тэрмін пакарання або прыняць рашэнне аб спыненні яго выканання.

14. Асуджаны мае права абскардзіць рашэнне службовай асобы аб накладанні пакарання вышэйстаячай службовай асобе, пракурору або ў суд. У выпадку абскарджання асуджаным рашэння аб накладанні пакарання яго выкананне не прыпыняецца. Пры наяўнасці падстаў пакаранне можа быць адменена ці заменена службовай асобай, якая прымяніла яго, або вышэйстаячай службовай асобай, якая мае на гэта права, або адменена пракурорам ці судом.

15. Лічыцца, што асуджаны не мае пакаранняў, калі на працягу двух месяцаў з дня накладання апошняга пакарання ён не быў падвергнуты новаму пакаранню.».

21. Дапоўніць Кодэкс артыкуламі $61^1$ і $61^2$ наступнага зместу:

**«Артыкул $61^1$. Службовыя асобы, якія прымяняюць меры заахвочвання і пакарання да асуджаных да арышту**

1. Прымяняць меры заахвочвання і пакарання да асуджаных у поўным аб'ёме маюць права начальнікі арыштных дамоў, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы. Пры размяшчэнні арыштнага дома на тэрыторыі іншай установы крымінальна-выканаўчай сістэмы пакаранне ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар прымяняецца начальнікам установы крымінальна-выканаўчай сістэмы, на тэрыторыі якой размешчаны арыштны дом.

2. Датэрмінова здымаць пакаранні з асуджанага маюць права службовыя асобы, якія наклалі пакаранні, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы.

3. Пералік вышэйстаячых службовых асобаў, якія маюць права прымяняць меры заахвочвання і пакарання да асуджаных, а таксама датэрмінова здымаць пакаранні з асуджаных, вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў і Правіламі ўнутранага распарадку следчых ізалятараў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул $61^2$. Крытэрыі і ступень выпраўлення асуджаных да арышту**

1. Ступень выпраўлення асуджанага вызначаецца адміністрацыяй арыштнага дома па выніках яго атэстацыі да разгляду пытання аб прадстаўленні асуджанага да ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем.

2. Пры размяшчэнні арыштнага дома на тэрыторыі іншай установы крымінальна-выканаўчай сістэмы ступень выпраўлення асуджанага вызначаецца адміністрацыяй арыштнага дома пры начальніку ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы, на тэрыторыі якой размешчаны арыштны дом.

3. Можа быць прызнана, што асуджаны цвёрда стаў на шлях выпраўлення, калі ён прыняў пісьмовае абавязацельства аб правапаслухмяных паводзінах, не мае пакаранняў, добрасумленна ставіцца да выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні арыштнага дома і прыняў усе залежныя ад яго меры па пакрыцці ўрону, які нанесены злачынствам.

4. Можа быць прызнана, што асуджаны даказаў сваё выпраўленне, калі яго паводзіны адпавядаюць крытэрыям, названым у частцы 3 гэтага артыкула, і сведчаць пра тое, што ў асуджанага сфарміравана гатоўнасць весці правапаслухмяны лад жыцця.

5. Парадак атэстацыі асуджаных вызначаецца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.».

22. У артыкуле 65:

у частках 4 і 6 словы «пад канвоем» замяніць словамі «ў парадку, вызначаным Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь»;

частку 8 выключыць.

23. У частцы 2 артыкула 66:

словы «адкрытай» і «псіхічна хворыя» замяніць адпаведна словамі «актыўнай» і «асобы, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў)»;

словы «ВІЧ-інфіцыраваныя, хворыя на СНІД,» выключыць.

24. Частку 1 артыкула 67 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін не звыш сямі гадоў з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага або ўзмоцненага рэжымаў, якія раней не адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з іх згоды могуць быць пакінутыя ў следчым ізалятары або турме для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні.».

25. У артыкуле 68:

частку 2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«2. Калі будзе прызнана, што асуджаныя да пазбаўлення волі, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях для асобаў, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, папраўчых калоніях для асобаў, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, выхаваўчых калоніях, сталі на шлях выпраўлення, іх пераводзяць на палепшаныя ўмовы ўтрымання пасля адбывання адной чвэрці тэрміну пакарання, а тых, хто ўтрымліваецца ў папраўчых калоніях асаблівага рэжыму, — пасля адбывання адной трэці тэрміну пакарання. Калі будзе прызнана, што такія асуджаныя зламысна парушаюць вызначаны парадак адбывання пакарання, палепшаныя ўмовы ўтрымання пастановай начальніка папраўчай установы адмяняюцца.»;

з часткі 3 словы «, альбо адмену ўсіх палепшаных умоў утрымання ў выпадках, прадугледжаных часткай першай артыкула 112 і пунктам 6 артыкула 129 гэтага Кодэкса» выключыць.

26. У артыкуле 69:

у пункце 1 часткі 3 слова «трэці» замяніць словам «чвэрці»;

пункт 4 часткі 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4) якім прызначаны прымусовыя меры бяспекі і лячэння, хворыя на актыўную форму туберкулёзу або якія не прайшлі поўнага курса лячэння венерычнага захворвання;».

27. Частку $1^1$ артыкула 71 выключыць.

28. У артыкуле 73:

частку 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. У парадку, што вызначаны гэтым Кодэксам, асуджаныя маюць права набываць па безнаяўным разліку прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці, мець спатканні, атрымліваць пасылкі, перадачы, бандэролі і дробныя пакеты, грашовыя пераводы, весці перапіску і тэлефонныя размовы, а таксама адпраўляць пасылкі, бандэролі, дробныя пакеты і грашовыя пераводы блізкім сваякам. Асуджаным дазваляецца атрыманне адной рэчавай пасылкі (абутак, адзенне і іншыя прамысловыя тавары, якія асуджаныя могуць мець пры сабе, акрамя прадуктаў харчавання і тытунёвых вырабаў) у год.»;

у частцы 6 словы «чацвёртай» і «і бандэролі» замяніць адпаведна лічбай «4» і словамі «, бандэролі і дробныя пакеты»;

у частцы 8 словы «забароненыя прадметы і рэчы, пералік якіх вызначаецца» замяніць словамі «прадметы і рэчы, якія не ўваходзяць у пералік прадметаў і рэчаў, дазволеных да атрымання і захоўвання, вызначаны».

29. Артыкул 74 дапоўніць часткай 3 наступнага зместу:

«3. Адміністрацыя папраўчых устаноў абавязаная пад распіску паведамляць асуджаным аб выкарыстанні ў дачыненні да іх сродкаў кантролю і нагляду.».

30. Пункт 1 часткі 2 артыкула 76 пасля слова «бандэроляў,» дапоўніць словамі «дробных пакетаў,».

31. У артыкуле 81:

у частцы 5 слова «сістэматычнага» замяніць словам «зламыснага»;

у частцы 8 словы «на туберкулёз, пры наяўнасці медыцынскага заключэння аб тым» замяніць словамі «на актыўную форму туберкулёзу, у выпадку, калі па выніках медыцынскага абследавання паказана».

32. Артыкул 82 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 82. Набыццё асуджанымі да пазбаўлення волі прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі штомесяц могуць набываць прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці па безнаяўным разліку за кошт грашовых сродкаў, якія маюцца на іх асабовых рахунках, у памерах, вызначаных артыкуламі 118—121, 125 і 126 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку нерасходавання дазволеных грашовых сродкаў у бягучым месяцы асуджаныя могуць набываць прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці на нерасходаваную суму ў наступныя месяцы.

3. Асуджаным, якія перавыконваюць норму выпрацоўкі або ўзорна выконваюць устаноўленыя заданні на цяжкіх працах, а таксама на працах са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы, адміністрацыя ўстановы мае права павялічваць памер грашовых сродкаў, дазволеных для расходавання, у межах вызначанага памеру базавай велічыні, прадугледжанай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Асуджаныя, абавязаныя пакрываць выдаткі на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, а таксама асуджаныя, якія не пакрылі ўрон, нанесены злачынствам, штомесяц могуць набываць прадукты харчавання на суму да адной базавай велічыні і прадметы першай неабходнасці на суму да адной базавай велічыні.

5. Асуджаным, якія прызнаны злоснымі парушальнікамі вызначанага парадку адбывання пакарання, дазваляецца штомесяц расходаваць грошы ў суме да адной базавай велічыні на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці.

6. Асуджаным, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых і выхаваўчых калоніях, а таксама асуджаным, якія пакінуты ў следчых ізалятарах і турмах для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні, дазваляецца замест атрымання належнай пасылкі або перадачы набываць на працягу месяца прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці на суму да пяці базавых велічынь за кошт грашовых сродкаў, якія маюцца на іх асабовых рахунках. Гэтае права не распаўсюджваецца на асуджаных, абавязаных пакрываць выдаткі на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаных, якія не пакрылі ўрон, нанесены злачынствам, а таксама на асуджаных, якія прызнаны злоснымі парушальнікамі вызначанага парадку адбывання пакарання.

7. Пералік прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці, дазволеных да набыцця і захоўвання асуджанымі, вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.».

33. Частку 3 артыкула 83 пасля слоў «сваякамі асуджанага,» дапоўніць словам «кароткатэрміновыя».

34. Артыкул 84 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 84. Атрыманне і адпраўленне асуджанымі да пазбаўлення волі пасылак, бандэроляў і дробных пакетаў, атрыманне перадач**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі дазваляецца атрыманне пасылак, перадач, бандэроляў і дробных пакетаў у колькасці, вызначанай артыкуламі 118—121, 125 і 126 гэтага Кодэкса. Максімальная вага пасылкі, бандэролі і дробнага пакета вызначаецца Правіламі аказання паслуг паштовай сувязі, якія зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

2. Пасылкі, перадачы, бандэролі і дробныя пакеты, якія паступілі не ад блізкіх сваякоў, уручаюцца асуджаным з дазволу начальніка папраўчай установы.

3. Хворым асуджаным і асуджаным, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы, дазваляецца атрыманне дадатковай бандэролі або дробнага пакета з лекавымі сродкамі па заключэнні лечачага ўрача, якія захоўваюцца і выдаюцца медыцынскай часткай папраўчай установы, а таксама дадатковай пасылкі або перадачы на працягу трох месяцаў з прадуктамі харчавання, рэкамендаванымі ўрачом.

4. Асуджаныя маюць права адпраўляць пасылкі, бандэролі і дробныя пакеты блізкім сваякам, а з дазволу адміністрацыі папраўчай установы — і іншым асобам.

5. Парадак прыёму, атрымання, адпраўлення пасылак, бандэроляў і дробных пакетаў, атрымання перадач, іх агляду, а таксама пералік прадметаў і рэчаў, дазволеных да атрымання, захоўвання, адпраўлення асуджанымі, вызначаюцца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.».

35. Артыкул 86 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 86. Тэлефонныя размовы асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі даецца права на тэлефонныя размовы з блізкімі сваякамі ў колькасці і парадку, вызначаным Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў. Працягласць кожнай размовы не павінна перавышаць пятнаццаць хвілін. Тэлефонныя размовы аплачваюцца асуджанымі за кошт сродкаў, якія маюцца на іх асабовых рахунках, і кантралююцца адміністрацыяй папраўчай установы.

2. Тэлефонныя размовы паміж асуджанымі, якія ўтрымліваюцца ў розных папраўчых установах, забараняюцца.

3. Тэлефонныя размовы асуджаным, якія ўтрымліваюцца ў штрафных (дысцыплінарных) ізалятарах, памяшканнях камернага тыпу і адзіночных камерах, даюцца толькі пры наяўнасці выключных абставінаў.

Заўвага. Пад выключнымі абставінамі ў частцы 3 гэтага артыкула разумеюцца смерць або цяжкае захворванне блізкага сваяка, якое пагражае яго жыццю, стыхійнае бедства, якое нанесла значны матэрыяльны ўрон асуджанаму або яго сям'і.».

36. У артыкуле 89:

у частцы 1 словы «і бандэролях» замяніць словамі «, бандэролях і дробных пакетах»;

частку 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«3. Бандэролі і дробныя пакеты з літаратурай, якая набываецца праз гандлёвую сетку, не ўключаюцца ў колькасць бандэроляў і дробных пакетаў, якія маюць права атрымліваць асуджаныя.».

37. У артыкуле 90:

у частцы 1 слова «трэці» замяніць словам «чвэрці»;

у частцы 3:

словы «на адкрытую форму туберкулёзу або якія не прайшлі поўны курс лячэння венерычнага захворвання, алкагалізму, таксікаманіі, наркаманіі, ВІЧ-інфіцыраваных, хворых на СНІД, псіхічна хворых, прызнаных зменшана свядомымі» замяніць словамі «на актыўную форму туберкулёзу, або якія не прайшлі поўны курс лячэння алкагалізму, таксікаманіі, наркаманіі, асобаў, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў)»;

словы «; асуджаных, якія не маюць пастаяннага месца жыхарства; асуджаных іншаземцаў і асобаў без грамадзянства» выключыць.

38. Пункт 4 часткі 2 артыкула 91 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4) маюць права адпраўляць і атрымліваць пісьмы, пасылкі, перадачы, бандэролі, дробныя пакеты, ажыццяўляць спатканні без абмежавання.».

39. У частцы 4 артыкула 92 словы «першай, другой і трэцяй», «адкрытай» і «венерычнага захворвання, алкагалізму, таксікаманіі, наркаманіі, ВІЧ-інфіцыраваным, хворым на СНІД, псіхічна хворым, прызнаным зменшана свядомымі» замяніць адпаведна словамі «1, 2 і 3», «актыўнай» і «алкагалізму, таксікаманіі, наркаманіі, асобам, якія пакутуюць ад псіхічных расстройстваў (захворванняў)».

40. Частку 6 артыкула 93 выключыць.

41. У артыкуле 94:

у частцы 2 словы «і абуткам па сезоне» замяніць словамі «па сезоне і абуткам»;

у частцы 6 слова «хваробы» замяніць словам «захворванню».

42. У артыкуле 96:

з часткі 1 словы «лячэбна-прафілактычныя ўстановы:» выключыць;

у частцы 2 словы «Лячэбна-прафілактычная» і «арганізоўваецца і праводзіцца» замяніць адпаведна словамі «Аказанне медыцынскай дапамогі» і «арганізоўваюцца і праводзяцца»;

частку 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Аказанне медыцынскай дапамогі асуджаным, а таксама дзяржаўны санітарны нагляд у месцах пазбаўлення волі ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.»;

дапоўніць артыкул часткай 5 наступнага зместу:

«5. Пры адсутнасці ў месцах пазбаўлення волі магчымасці аказання хуткай (неадкладнай) або планавай медыцынскай дапамогі, у тым ліку спецыялізаванай (анкалагічнай, кардыялагічнай, фтызіятрычнай і іншых відаў дапамогі), неабходная медыцынская дапамога аказваецца асуджаным у арганізацыях аховы здароўя.».

43. Частку 2 артыкула 97 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«2. Асуджаны абавязаны пакрываць урон (кампенсаваць шкоду), нанесены папраўчай установе ў выніку сваіх супрацьпраўных дзеянняў, дадатковыя затраты, звязаныя з аказаннем яму медыцынскай дапамогі ў выпадку наўмыснага нанясення ім шкоды свайму здароўю. У выпадку ўчынення ўцёкаў з папраўчай установы, самавольнага пакідання папраўчай калоніі-пасялення асуджаны абавязаны ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, пакрываць расходы, затрачаныя на правядзенне мерапрыемстваў па яго вышуку, затрыманні і вяртанні ў папраўчую ўстанову.».

44. Частку 1 артыкула 98 дапоўніць чацвёртым сказам наступнага зместу: «Пры прыцягненні асуджаных да працы працоўны дагавор (кантракт) з імі не заключаецца.».

45. Артыкул 100 дапоўніць часткай 4 наступнага зместу:

«4. Заработная плата асуджаных падлягае індэксацыі ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.».

46. У частцы 3 артыкула 101 словы «дзвюх гадзін у дзень» замяніць словамі «чатырнаццаці гадзін у тыдзень».

47. У артыкуле 102:

частку 1 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. З заработнай платы і прыроўненых да яе даходаў у асуджаных да пазбаўлення волі, за выключэннем асуджаных, указаных у частцы 6 артыкула 94 гэтага Кодэкса, ажыццяўляюцца ўтрыманні для пакрыцця кошту харчавання, адзення і абутку (акрамя кошту спецыяльнага харчавання і спецыяльнага адзення), камунальна-бытавых паслуг у парадку, вызначаным Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Кошт харчавання і камунальна-бытавых паслуг, не ўтрыманы ў справаздачным месяцы ў асобаў, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах, у выпадку недастатковасці іх заработнай платы і прыроўненых да яе даходаў запазычанасці не ўтварае і ў наступныя месяцы не ўтрымліваецца. Указаны кошт спісваецца на расходы па каштарысе на ўтрыманне папраўчай установы.»;

частку 3 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «На асабовы рахунак асуджаных, абавязаных пакрываць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, залічваецца не менш за 10 працэнтаў налічанай заработнай платы і іншых даходаў.».

48. У артыкуле 109:

з часткі 1 словы «, якія не дасягнулі трыццацігадовага ўзросту,» выключыць;

частку 2 выключыць.

49. З часткі 1 артыкула 110 пункты 5 і 10 выключыць.

50. У пункце 2 часткі 2 артыкула 111 словы «3—5 часткі першай» замяніць словамі «3 і 4 часткі 1».

51. У частцы 1 артыкула 112:

з пункта 3 словы «і забарона на тэрмін да аднаго месяца набываць прадукты харчавання» выключыць;

пункт 5 выключыць;

у пункце 6 слова «пятнаццаці» замяніць словам «дзесяці»;

у пункце 7 словы «якія злосна парушаюць», «аднаго года» і «першай» замяніць адпаведна словамі «прызнаных злоснымі парушальнікамі», «шасці месяцаў» і лічбай «1».

52. З часткі 5 артыкула 113 словы «і забароны на тэрмін да аднаго месяца набываць прадукты харчавання» выключыць.

53. У артыкуле 114:

у частцы 1:

пасля слова «забараняюцца» дапоўніць частку словам «працяглыя»;

словы «і бандэроляў» замяніць словамі «, бандэроляў і дробных пакетаў»;

у частцы 2:

у пункце 1 словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 2 пасля слова «бандэроль» дапоўніць словамі «або дробны пакет»;

частку 4 выключыць.

54. У артыкуле 115:

частку 3 выключыць;

з часткі 4 словы «дазволу дадаткова расходаваць грошы ў памеры дзвюх базавых велічынь на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці,» выключыць.

55. Артыкулы 116 і 117 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 116. Крытэрыі і ступень выпраўлення асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Ступень выпраўлення асуджанага да пазбаўлення волі вызначаецца адміністрацыяй папраўчай установы па выніках атэстацыі асуджанага на падставе ўсебаковага вывучэння яго асобы і ацэнкі паводзінаў у перыяд адбывання пакарання ў частцы адпаведнасці асуджанага крытэрыям, прадугледжаным часткамі 3—5 гэтага артыкула.

2. Можа быць прызнана, што асуджаны стаў на шлях выпраўлення, цвёрда стаў на шлях выпраўлення і даказаў сваё выпраўленне пасля адбывання не менш за адну чвэрць тэрміну пакарання.

3. Можа быць прызнана, што асуджаны стаў на шлях выпраўлення, калі ён прыняў пісьмовае абавязацельства аб правапаслухмяных паводзінах, не мае спагнанняў, добрасумленна ставіцца да працы або вучобы, выканання работ па калектыўным самаабслугоўванні, уборцы і добраўпарадкаванні папраўчых устаноў і прылеглых да іх тэрыторый і выказвае карысную ініцыятыву ў іншай карыснай для грамадства дзейнасці, а асуджаны, які не пагасіў да пастановы прыгавору ўрон, нанесены злачынствам, — калі ён таксама прыняў усе залежныя ад яго меры па пакрыцці ўрону.

4. Можа быць прызнана, што асуджаны цвёрда стаў на шлях выпраўлення, калі яго паводзіны адпавядаюць крытэрыям, указаным у частцы 3 гэтага артыкула, і сведчаць пра ўстойлівае імкненне да правапаслухмяных паводзінаў.

5. Можа быць прызнана, што асуджаны даказаў сваё выпраўленне, калі яго паводзіны адпавядаюць крытэрыям, указаным у частцы 3 гэтага артыкула, і сведчаць пра тое, што ў асуджанага сфарміравалася гатоўнасць весці правапаслухмяны лад жыцця.

6. Парадак атэстацыі асуджаных вызначаецца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 117. Зламыснае парушэнне асуджанымі да пазбаўлення волі вызначанага парадку адбывання пакарання**

1. Асуджаны да пазбаўлення волі прызнаецца злосным парушальнікам вызначанага парадку адбывання пакарання адміністрацыяй папраўчай установы на працягу тэрміна дзеяння спагнанняў, калі ён мае не менш за:

1) чатыры спагнанні, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса, а для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, — пунктамі 1 і 2 артыкула 129 гэтага Кодэкса;

2) тры спагнанні, адно з якіх прадугледжана пунктамі 3 і 4 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса, а для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, — пунктамі 3 і 4 артыкула 129 гэтага Кодэкса;

3) два спагнанні, адно з якіх прадугледжана пунктам 6 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса, а для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, — пунктам 5 артыкула 129 гэтага Кодэкса.

2. Злосным парушальнікам вызначанага парадку адбывання пакарання на працягу аднаго года прызнаецца асуджаны, які ўчыніў у перыяд адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі наўмыснае злачынства, за якое ён асуджаны да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, а таксама асуджаны, якому пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі было заменена больш мяккім пакараннем або які быў вызвалены ад пакарання ўмоўна-датэрмінова або датэрмінова на падставе акта амністыі або акта памілавання і ўчыніў на працягу неадбытага тэрміну пакарання наўмыснае злачынства, за якое быў асуджаны да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі.

3. Тэрмін, на працягу якога асуджаны прызнаецца злосным парушальнікам вызначанага парадку адбывання пакарання ў адпаведнасці з часткай 2 гэтага артыкула, вылічваецца з дня ўзяцця пад варту асобы, асуджанай да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства, учыненае ў перыяд адбывання пакарання або на працягу неадбытай часткі тэрміну пакарання.

4. Прызнанне асуджанага злосным парушальнікам вызначанага парадку адбывання пакарання і спыненне прызнання асуджанага злосным парушальнікам вызначанага парадку адбывання пакарання ажыццяўляюцца адміністрацыяй папраўчай установы пры правядзенні атэстацыі.».

56. У артыкуле 118:

у частцы 1:

у пункце 1:

слова «да» выключыць;

словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 3 пасля слова «бандэролі» дапоўніць словамі «або два дробныя пакеты»;

у частцы 2:

у пункце 1 словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 3 пасля слова «бандэролі» дапоўніць словамі «або два дробныя пакеты».

57. У частках 1 і 2 артыкулаў 119—121:

у пункце 1 словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 3 пасля слова «бандэролі» дапоўніць словамі «або два дробныя пакеты».

58. У пункце 4 часткі 4 артыкула 122 словы «і бандэролі» замяніць словамі «, бандэролі і дробныя пакеты».

59. У артыкуле 123:

у частцы 1 словы «вызначаных для лячэбных устаноў» замяніць словамі «правілаў і гігіенічных нарматываў, вызначаных для арганізацый аховы здароўя»;

у частцы 6 словы «цяжкай хваробы» і «якая ставіць» замяніць адпаведна словамі «цяжкага захворвання» і «які ставіць»;

у частцы 7 словы «бандэролі, пасылкі або перадачы» замяніць словамі «пасылкі, перадачы, бандэролі або дробныя пакеты»;

частку 8 дапоўніць словам «асобаў».

60. У артыкуле 125:

у частцы 4:

у пункце 1 словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 3 пасля слова «бандэролі» дапоўніць словамі «або два дробныя пакеты»;

у частцы 5:

у пункце 1 словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 3 пасля слова «бандэроль» дапоўніць словамі «або адзін дробны пакет»;

дапоўніць артыкул часткай 6 наступнага зместу:

«6. Для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў турме, перавод на палепшаныя ўмовы ўтрымання не прадугледжваецца.».

61. Пункт 3 часткі 1 артыкула 126 пасля слова «бандэролі» дапоўніць словамі «або два дробныя пакеты».

62. У артыкуле 127:

пункты 5 і 10 выключыць;

у пункце 9 слова «трэці» замяніць словам «чвэрці».

63. У артыкуле 129:

з пункта 3 словы «і забарону на тэрмін да аднаго месяца набываць прадукты харчавання» выключыць;

у пункце 5 слова «дзесяці» замяніць словам «сямі»;

пункт 6 выключыць.

64. У частцы 2 артыкула 130:

слова «спаткання,» выключыць;

словы «і бандэроляў» замяніць словамі «, бандэроляў і дробных пакетаў»;

дапоўніць частку трэцім сказам наступнага зместу: «Пасцельныя рэчы выдаюцца ім толькі на перыяд сну.».

65. З часткі 3 артыкула 131 словы «, дазволу дадаткова расходаваць грошы ў суме да 50 працэнтаў базавай велічыні на пакупку прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці» выключыць.

66. У частцы 3 артыкула 146 словы «маюць начальнік гарнізона і» замяніць словам «мае».

67. У артыкуле 151:

у назве артыкула, частках 2, 3 і 5 словы «і бандэролі» замяніць словамі «, бандэролі і дробныя пакеты» ў адпаведным склоне;

частку 1 пасля слова «бандэроляў» дапоўніць словамі «або дробных пакетаў».

68. У частцы 1 артыкула 153 слова «трох» замяніць словам «пяці».

69. У артыкуле 160:

у частцы 1:

у абзацы першым словы «1. Да асуджаных» замяніць словамі «Да асуджаных»;

пункт 7 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«7) арышт з утрыманнем на гаўптвахце дысцыплінарнай вайсковай часці на тэрмін да дзесяці сутак.»;

частку 2 выключыць.

70. У частках 5 і 6 артыкула 173:

у пункце 1 словы «першай і другой» замяніць лічбамі «2—6»;

пункт 3 пасля слова «бандэролі» дапоўніць словамі «або два дробныя пакеты».

71. У артыкуле 176:

частку 1 пасля слова «расстройства» дапоўніць словам «(захворвання)»;

у частцы 2 слова «захворвання» замяніць словамі «расстройства (захворвання)».

72. У пункце 6 артыкула 186 словы «цяжкая хвароба» замяніць словамі «цяжкае захворванне».

73. У артыкуле 187:

частку 3 пасля слова «дзеянню» дапоўніць словамі «, інфармацыя аб ліквідаванні наступстваў учыненага дзеяння, аб прызнанні віны ва ўчыненым злачынстве»;

у частцы 5 словы «псіхічнай хваробы» замяніць словамі «псіхічнага расстройства («захворвання)»;

у частцы 6 словы «іншай цяжкай хваробы» замяніць словамі «іншага цяжкага захворвання»;

дапоўніць артыкул часткай $7^1$ наступнага зместу:

«$7^1$. Парадак медыцынскага агляду і пералік захворванняў, якія перашкаджаюць далейшаму адбыванню пакарання, вызначаюцца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.».

74. Частку 2 артыкула 192 пасля слова «асуджанымі» дапоўніць словамі «з дня фактычнага адбывання імі пакарання».

75. У частцы 1 артыкула $199^1$ словы «вызвалення з лячэбна-працоўнага прафілакторыя» замяніць словамі «спынення яго знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі».

**Артыкул 3.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь ў адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 4.** Гэты Закон уваходзіць у сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 3, якія ўваходзяць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**

*5 мая 2010 года, г. Мінск.*
*№ 123—З*

---

**Тэкст з'яўляецца неафіцыйным перакладам Закона.**

**Афіцыйнае апублікаванне ажыццяўляецца ў афіцыйным перыядычным выданні «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь».**

